ІВАН ЧЫГРЫНАЎ

# ХТО ВІНАВАТЫ

ДРАМАТЫЧНАЯ ФАНТАЗІЯ
НА ЧАРНОБЫЛЬСКУЮ ТЭМУ
Ў ДЗВЮХ ДЗЕЯХ



І В А Н Ч Ы Г Р Ы Н А Ў

# ХТО ВІНАВАТЫ

ДРАМАТЫЧНАЯ ФАНТАЗІЯ
НА ЧАРНОБЫЛЬСКУЮ ТЭМУ
Ў ДЗВЮХ ДЗЕЯХ

# ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ

- **Левановіч –** *вучоны-энергетык*
- **Людміла Міхайлаўна –** *жонка Левановіча.*
- **Андрэй –** *брат Левановіча, лётчык з падраздзялення так званай «кліматычнай вайны»*
- **Пісьменнік Павел Дзямідавіч**
- **Антаніна і Вальдэмар –** *проста муж і жонка, нейкія сябры сям'і Левановічаў*
- **Анатоль Іванавіч –** *сябра Левановічаў*
- **Даўгучыц –** *сябра Левановічаў*
- **Камандзір падраздзялення**
- **Капітан-І**
- **Капітан-ІІ**
- **Селянін-І**
- **Селянін-ІІ**
- **Селянін-ІІІ**
- **Васіль Сцяпанавіч –** *сакратар партыйнага камітэта*
- **Ляснік –** *першы мужык*
- **Пчаляр –** *другі мужык*
- **Раман Антонавіч –** *дырэктар саўгаса*
- **Дзіна Давыдаўна –** *вясковая настаўніца*
- **Карэспандэнт** *(з экрана)*
- **Міліцыянер**

# ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

## К А Р Ц І Н А І

*Прыстойная па нашым часе кватэра. Вечар. Многа кветак. Над сталом, устаўленым па краях крышталёвымі чаркамі і пустымі фарфоравымі сподкамі, палае вялікае люстра ў выглядзе кароны. Астатняе абсталяванне ў кватэры таксама найноўшае. Відаць, што збіраецца нейкая пагулянка. Той-сёй з гасцей ужо тут: малады чалавек у вайсковай форме лётчыка; сямейная пара – ён і яна; і яшчэ адзін мужчына, ужо ў гадах, але з выглядам усё роўна як маладога.*

*Лётчыка завуць Андрэем. Сямейную пару – Антанінай і Вальдэмарам. Вядома, мае сабе імя і мужчына з выглядам усё роўна як маладога чалавека – Анатоль Іванавіч. З кухні ў пакой заходзіць з талеркамі ў руках гаспадыня Людміла Міхайлаўна ў палатняным фартуху.*

**Людміла Міхайлаўна.** Ну вось, стол ужо, лічы, падрыхтаваны. Засталося паставіць выпіўку ды закуску.

**Анатоль Іванавіч** *(нібыта злавесна).* Ужо поўнач наступае, а Германа няма...

**Антаніна.** А я колькі помню госці ў Левановічаў, дык...

**Людміла Міхайлаўна.** Ты ўжо дагаворвай, Антаніна, чым табе не падабаюцца госці ў Левановічаў?

**Вальдэмар.** Мая жонка хоча сказаць, што гаспадар, гэта значыць Левановіч Эдуард Сямёнавіч, у свой дзень нараджэння заўсёды спазняецца на вячэру ў дом.

**Анатоль Іванавіч.** Во-во, Людміла Міхайлаўна, спазняецца ваш супруг, дарма што кожны раз гасцей запрашае.

**Людміла Міхайлаўна.** Я зноў у лабараторыю пазваню.

**Анатоль Іванавіч.** Пазвані, пазвані, Людміла Міхайлаўна, пашукай свайго супруга.

**Людміла Міхайлаўна.** Неяк вы, Анатоль Іванавіч, задужа змрочна?..

**Анатоль Іванавіч.** Гэта незнарок. Сёння чамусьці ўвесь час у крайнасці мяне кідае. Дарэчы, дзе гэта падзеўся Даўгучыц? Ён што, на кухні ў вас, Людміла Міхайлаўна?

**Людміла Міхайлаўна.** Што, вы не ведзеце, дзе можна знайсці ў чужым доме Даўгучыца? Пакуль усе выгоды не ацэніць ды не паспрабуе...

*Усе смяюцца.*

**Анатоль Іванавіч.** Ды ўжо ж...

*Зноў усе смяюцца. Як на тое, заходзіць Даўгучыц.*

**Даўгучыц.** Бачу, і сёння Эдзік верны сабе. Няйначай, другую кампанію недзе частуе.

**Людміла Міхайлаўна.** Штосьці не падобна. Я ўжо колькі разоў званіла – лабараторыя не адказвае. А можа б, ты, Андрэй, заняўся гэтым? *(Глядзіць на лётчыка).* Усё-ткі брат твой.

**Андрэй** *(смяецца).* Брат мой, а муж твой. *(Устае з канапы, ідзе ў калідор).*

**Даўгучыц.** Ат, Эдзік заўсёды так.

**Анатоль Іванавіч.** Не гавары на чалавека лішняе.

**Даўгучыц.** Помню, гадоў пяць таму дык і зусім не прыйшоў. Можа, і сёння давядзецца папіць-паесці без імянінніка.

**Антаніна.** Як гэта без імянінніка?

**Вальдэмар.** Сапраўды, што пра нас падумаюць?

*І з гэтага чамусьці смяюцца.*

**Даўгучыц.** Гэта яшчэ што! Левановіч не паспеў да ўрачыстага стала ў свой дзень нараджэння! Гэта нават... Словам, за выдатным чалавекам штосьці такое павінна цягнуцца – ці анекдот, ці звычайная плётка. Без гэтага ў вышэйшым свеце няма асобы. Ды і ўвогуле...

**Людміла Міхайлаўна.** Што ўвогуле?

**Даўгучыц.** А тое, мадам, што не толькі шляхі госпаднія невядомыя, але і справы чалавечыя не заўсёды на віду. Я вось сёння быў на пісьменніцкім з’ездзе...

**Антаніна.** Ну і што нашы пісакі там новае выдумалі?

**Вальдэмар.** А што яны могуць выдумаць? Хіба што новую «Лысую гару».

**Анатоль Іванавіч.** Цікава, аўтара так і не знайшлі?

**Вальдэмар.** Дзе яго знойдзеш? Ананімны твор.

**Анатоль Іванавіч.** У наш час ды ананімны?

**Вальдэмар.** Крыміналісты перабольшваюць сваё аналітычнае значэнне. КДБ таксама. На абывацеля разлічана.

**Анатоль Іванавіч.** Вось што значыць галоснасць, дэмакратыя!.. Нават дзяржаўную бяспеку ўжо бяруць пад сумненне.

**Вальдэмар.** Пабойцеся бога, Анатоль Іванавіч, я не дзяржаўную бяспеку бяру, як вы кажаце, пад сумненне. Вы мяне не так зразумелі. Я меў на ўвазе цяперашнія тэхнічныя магчымасці крыміналістыкі.

**Антаніна.** Кіньце вы, а то, не дай бог, і праўда, дагаворыцеся.

**Анатоль Іванавіч.** Во-во, Антаніна Бацькаўна, сачыце за мужам, не давайце яму язык распускаць, дарма што на дварэ перабудова. Нябось, вершык гэты ведаеце?

*Товарищ, верь,*
*Пройдет она,*
*Так называемая гласность,*
*И комитет госбезопасности*
*Припомнит наши имена.*

**Антаніна.** Вучыся ў Анатоля Іванавіча, Вальдэмарчык.

**Вальдэмар.** Але ж Анатоль Іванавіч мастак даводзіць гаворку да небяспечнага моманту. Колькі помню, кожны раз вось гэтак – усе вінаватыя, адзін ён...

**Анатоль Іванавіч** *(паднімае рукі).* Цур-цур-цур!.. Ведаеце, як маё прозвішча па бацьку? Без блох. Так што... Шукайце вінаватых у іншым месцы.

*Заходзіць Андрэй.*

**Андрэй.** Глуха.

**Антаніна.** Нават на братаў званок не адказвае?

**Людміла Міхайлаўна.** Ладна, Андрэй, брат сабе як хоча, а мы... У нас ёсць і выпіць. і што закусіць чым, а найперш – госці. Будзем сядаць за стол. Ты нясі з ванны напіткі, а я хуценька зноў на кухню. Хто мне паможа?

**Андрэй.** А я і памагу. Прынясу бутэлькі, потым начну закусь насіць з кухні.

*Людміла Міхайлаўна з дзеверам выходзяць.*

**Вальдэмар** *(да Даўгучыца).* Дык што там на пісьменніцкім з'ездзе? У іх, нашых пісьменнікаў, хоць што, хоць дробненькае, але здарыцца. Дык што сёлета?

**Даўгучыц.** Усё тое ж – як вясной каля купіны, калі жабы ікру кладуць. Топчуць адзін аднаго. Але я не пра гэта хацеў. Зрэшты, пра з'езд вам раскажа дэлегат. Нябось, Людміла Міхайлаўна не забыла пра свайго куміра?

*Заходзіць з падносам гаспадыня.*

**Людміла Міхайлаўна** *(пачуўшы Даўгучыцавы словы).* І не забыла, і запрасіла, і на першы тост змовіла. *(Ставіць талеркі на стол).*

**Антаніна** *(паказваючы на паднос).* Хто цяпер носіць?.. Цяпер, Людмілачка, возяць посуд са стравамі на калёсіках. Адстаеце ад людзей, Левановічы!

**Людміла Міхайлаўна.** За людзьмі, Антаніначка, усё роўна не ўгонішся. Асабліва пры такім гаспадару, як мой. Ну, дзе яго носіць?

**Антаніна** *(смяецца).* А можа, гэта і добра, што мы тут без яго будзем. Няхай яму там ікнецца.

**Людміла Міхайлаўна** *(ужо нібыта ўзлавана).* Дзе гэта там?

**Антаніна.** Ну...

**Людміла Міхайлаўна.** Хіба што... Ты тут, Тонечка, сярод мужчын.. Хадзём-тка, лепей паможаш мне на кухаі.

**Антаніна.** Я ж даўно прапанавала табе свае паслугі.

**Вальдэмар.** Дапусцім, не ты сама, а я спрабаваў цябе надаўмець.

**Антаніна** *(пляскае мужа па руцэ).* А ты вечна!.. Падхалім!

*Заходзіць з бутэлькамі Андрэй.*

**Андрэй.** Хто падхалім?

**Даўгучыц.** Ды ўсе мы тут, таварыш старшы лейтэнант, падхалімы. Нявестку тваю ўлашчваем, каб без вячэры не застацца.

**Антаніна.** Дык што вы нам хацелі расказаць, пан Даўгучыц?

**Даўгучыц.** Ды вось ніяк не ўзаб'юся на першы сказ. Усе нечым заняты важным. А пра галоўнае...

**Анатоль Іванавіч.** Хто скажа – што цяпер галоўнае?

**Даўгучыц.** Галоўнае – заўсёды ў мінулым. Цяпер, бачыце, за Сталіна моцна бяруцца. Героямі становяцца Бухарын, Каменеў...

**Анатоль Іванавіч.** Ну, тут даўно ўсё зразумела. Раз узнікаюць гэтыя постаці, значыць, наступны з гістарычнай цемры выйдзе Леў Давыдавіч.

**Даўгучыц.** Ты так думаеш?

**Анатоль Іванавіч.** А тут і высільвацца дужа не варта.

**Даўгучыц.** Як сказаць. Але паслухайце.

**Антаніна.** Ну так, пра галоўнае... А хто такі Леў Давыдавіч?

**Анатоль Іванавіч.** Лейба Палтаўскі.

**Антаніна.** Хто-хто?

**Даўгучыц.** Анатоль Іванавіч усё яшчэ гуляе ў канспірацыю. Леў Троцкі.

**Антаніна.** А што, Анатоль Іванавіч у нас антысеміт?

**Анатоль Іванавіч.** Ну вы і скажаце, Антаніна Бацькаўна.

**Антаніна.** Дарэчы, у майго бацькі імя ёсць, таксама штосьці падобнае на Лейбу.

**Анатоль Іванавіч.** Ну вы і скажаце, Антаніна...

**Антаніна.** Дагаворвайце. Як гэта павінна гучаць – Лейбаўна?

**Даўгучыц.** Ат, гаворыце абы пра што!.. Лепей і праўда паслухайце. Гэта мне расказаў сёння адзін журналіст. Чарненка, калі яшчэ жыў Брэжнеў, а Чарненка загадваў у ЦК кадрамі, сабраў у Маскву з усёй краіны загадчыкаў аддзелаў арганізацыйна-партыйнай работы. Парадак для нарады вызначаны не быў, але хадзілі ціхія чуткі, што на ёй будзе Брэжнеў. Таму ўсе прыехалі з тоўстымі партфелямі, набітымі паперамі на кожны выпадак. І вось выходзіць з бакавога пакоя Чарненка, а за ім... Не, не так. Спачатку выносяць велічэзны партрэт другога Ільіча, а ўжо за ім выходзіць Чарненка.

**Анатоль Іванавіч.** Дык дзе ж тут галоўнае?

**Даўгучыц.** Пачакай, гэта я, відаць, нецікава расказваю. Словам, два лэйбусы патрымалі з паўгадзіны на руках партрэт, тады Чарненка пытае ў загадчыкаў аддзелаў арганізацыйна-партыйнай работы – ну, як, падабаецца вам наш дарагі Леанід Ільіч? Так, так, заківалі галовамі загадчыкі. Ну вось, усё роўна як з палёгкай уздыхнуў Чарненка і загадаў лэйбусам выносіць партрэт. Загадчыкі думалі, што пасля гэтага нарэшце пачнецца нарада, але не, Чарненка падзякаваў усім, хто прыехаў на нараду, і распусціў.

**Анатоль Іванавіч.** Гэтую сцэну ў кіно паказваць бы.

**Антаніна.** Дык хіба не паказвалі самога Чарненку? Ужо амаль мёртвага. У бальніцы. Грышын падняў Генеральнага з ложка, падпёр нейкімі калкамі ззаду і загадаў кінахранікёрам здымаць.

**Анатоль Іванавіч.** Было, было і такое. Грышын хацеў быць Генсекам услед за Чарненкам, а перад тым Чарненка імкнуўся пераняць уладу ад Брэжнева. Цікава, як гэта Гарбачову ўдалося прабіцца на першае месца?

**Даўгучыц.** Пакуль тайна.

**Анатоль Іванавіч.** Ах, гэтыя тайны. Крамлёўскія тайны. Дарога для іх адтуль пакуль адна – альбо ў анекдоце выскачыць, альбо ў прамежак паміж зменай каравула, калі расчыняюцца на нейкі момант жалобныя вароты.

**Людміла Міхайлаўна.** Была я сёння на рынку што-кольвечы дакупіць да стала. Дык там нейкі юродзівы выступаў. Я ажно здзівілася, чаму не забірае яго міліцыя?

**Даўгучыц.** Было за што?

**Людміла Міхайлаўна.** Ды ў нас цяпер любога бяры і саджай за доўгі язык. Вас тут – кожнага.

**Анатоль Іванавіч.** Той гаспадыньку тады.

**Людміла Міхайлаўна.** А я і не адмаўляюся.

**Антаніна.** Вечна мы вось так – чалавек хоча нешта сказаць, а мы ўжо напагатове, наморднік на яго. Дайце Людмілачцы дагаварыць. Ну, дык што там юродзівы?

**Людміла Міхайлаўна.** Бэсціў усіх, Тонечка, бэсціў. Прадказваў канец свету. Казаў, што па біблейскаму пісанню прынясе яго з сабой нейкі мечаны. Пра Гарбачова ён не заікаўся. Але ўсе зразумелі, што якраз Гарбачоў і меўся на ўвазе. У яго ж на галаве знак.

**Анатоль Іванавіч.** Ну вось, а вы кажаце – няма за што вас саджаць. Як гэта там сказана?

**Вальдэмар.** Дзе?

**Анатоль Іванавіч.** Ну, у тым вершыку. Пра галоснасць, ЧК і перабудову.

**Вальдэмар.** Пабойцеся бога, Анатоль Іванавіч. Вы ж самі яго нядаўна дэкламавалі.

**Анатоль Іванавіч.** Няўжо? Якая неасцярожнасць!

**Вальдэмар.** Альбо знарочыстасць.

**Анатоль Іванавіч.** Выходзіць, што я правакатар?

**Антаніна** *(ускідваецца).* Ну-ну, хлопчыкі!

**Людміла Міхайлаўна.** Але ж трэба хутчэй саджаць вас за стол, а то азвярэеце. *(Выходзіць).*

**Антаніна.** Нам бы хіраманта цяпер сюды, каб развёў нас.

**Вальдэмар.** Ці хоць бы цыганку.

**Антаніна.** Кажуць, экстрасенсы хутка будуць мець у краіне вялікую сілу.

**Анатоль Іванавіч.** Можа, і праўда перакваліфікавацца?

**Антаніна.** А што? Адзін мой знаёмы так і зрабіў.

**Анатоль Іванавіч.** Ну і што, дасягнуў поспеху?

**Антаніна.** Ва ўсякім разе, падае надзеі. Але... Словам, яшчэ ўсё наперадзе. А таварыш Гарбачоў сапраўдны чалавек... Ну, незразумелы. Прынамсі, для мяне.

**Даўгучыц.** Навошта дарэмна непакоіцца? Няхай ён сабе працягвае цараваць над намі, а мы будзем...

**Анатоль Іванавіч.** А мы?

**Антаніна.** А мы будзем тым часам патрохі пляткарыць пра яго.

**Даўгучыц.** А найбольш – пра яго жонку, Раісу Максімаўну.

**Анатоль Іванавіч.** Дарэчы, чаму яе так ненавідзяць жанчыны?

**Антаніна.** Хіба толькі жанчыны?

**Анатоль Іванавіч.** Ва ўсякім разе...

**Антаніна.** Ва ўсякім разе, няхай дужа не вылазіць наперад мужа.

**Анатоль Іванавіч.** Усё-ткі зайздрасць?

**Даўгучыц.** Ну, тут штосьці іншае. Можа, вінаваты найперш погалас людскі. Гэта як перад вывяржэннем вулкана. Людзі глуха наракаюць на штосьці, а ніхто пакуль не разумее – праз што, дзеля чаго. Таму і вінаватых шукаюць не там, дзе трэба. Ну, а тут Раіса Максімаўна... Як не ўключыш тэлевізар, дык яна. Ды наперад усіх.

**Анатоль Іванавіч.** Нічога, прывыкнеце.

**Вальдэмар.** Было б дзеля чаго.

**Анатоль Іванавіч.** Гэта ўжо лёс такі ўсіх царыц.

**Вальдэмар.** А Кацярына?..

**Анатоль Іванавіч.** Ну, тады жанчыны самі царавалі!

**Антаніна.** Але ж і размовы сёння ў нас!

**Даўгучыц.** Дык яны ва ўсіх цяпер такія размовы. Дападзі да столі ці да падлогі – ва ўсіх кватэрах пра адно і тое ж: глухія нараканні, далёкае клакатанне лавы пад зямлёй. Так што... А што наконт усяго гэтага ваш знаёмы гаворыць?

**Антаніна.** Які?

**Даўгучыц.** Ну, той, што падаўся ў хіраманты.

**Вальдэмар.** Усё ўжо прадказана. У Бібліі.

**Даўгучыц.** У Бібліі?

**Вальдэмар.** Ну так, у Бібліі. Недзе ж у Левановічаў ёсць Біблія? *(Устае з канапы, ідзе ў сумежны пакой, прыносіць адтуль кнігу).*

**Антаніна** *(працягвае руку).* Пакажы!

**Вальдэмар.** А ці дастойна ты ўзяць у рукі ды зняць з яе пячаткі? *(Да Анатоля Іванавіча).* Дзе тут?.. У якім раздзеле найбольш прадказанняў?

**Анатоль Іванавіч.** Адгортвай апошнія старонкі ў Новым пісанні – адкравенне Іаана Багаслова.

**Вальдэмар** *(чытае).* І калі Ён зняў чацвёртую пячатку, я чуў голас чацвёртай жывёліны, якая гаварыла: ідзі і глядзі. І я глянуў, і вось, конь бледны, і на ім коннік, якому імя смерць; і пекла рухалася за ім, і дадзена яму ўлада над чацвёртаю часткай зямлі – забіваць мячом і голадам, і морам і звярамі зямнымі...

**Анатоль Іванавіч.** Гэта не зусім тое, Вальдэмар. Дайце мне.

*Вальдэмар падае кнігу. Анатоль Іванавіч шукае знаёмае месца ў ёй.*

**Антаніна.** Вы пра самае жахлівае, што будзе...

**Анатоль Іванавіч** *(чытае).* І сем Анёлаў, якія мелі сем труб, падрыхтаваліся трубіць. Першы Анёл пратрубіў, і выпаў град і агонь, змяшаныя з крывёю, і выпалі на зямлю; і трэцяя частка дрэў згарэла, і ўся трава зялёная згарэла. Другі Анёл пратрубіў, і нібыта вялікая гара, палаючы агнём, абрынулася

ў мора; і трэцяя частка мора зрабілася крывёю. Тады пратрубіў трэці Анёл, і ўпала з неба вялікая зорка, што гарэла, нібыта свяцільня, і пала на трэцюю частку рэк і на вытокі вод. Імя гэтай зорцы Палын; і трэцяя частка вод зрабілася палыном, і многія з людзей памерлі ад вод, таму што яны сталі горкія. Чацвёрты Анёл пратрубіў...

*Чуецца званок у дзверы. Андрэй ідзе ў калідор адчыняць. Трымаючы ў руках Біблію, Анатоль Іванавіч чакае, пакуль зойдзе ў пакой хтосьці новы.*

**Антаніна** *(спрабуе адгадаць).* Госць ці гаспадар?
**Вальдэмар.** Гаспадар...
**Даўгучыц.** Госць...
**Вальдэмар.** А можа, ке-ге-бе-е-е?

*Адчыняюцца дзверы, заходзіць з кветкамі Павел Дзямідавіч.*

**Пісьменнік.** Рад бачыць старую, але пачэсную кампанію. Дзе ж імяніннік?
**Даўгучыц.** Імяніннік, Павел Дзямідавіч, яшчэ на рабоце.
**Пісьменнік.** Колькі ж яе ў яго, тае работы?
**Антаніна.** А ён за ўсіх.
**Пісьменнік.** Ну што ж, за нас, а мы за яго.

*Заходзіць гаспадыня.*

**Людміла Міхайлаўна.** Павел Дзямідавіч правільна кажа – ён недзе за нас, а мы за яго.

**Пісьменнік.** Дазвольце, Людміла Міхайлаўна, пацалаваць ручку. І гэтыя кветкі вам нёс.

*Гаспадыня бярэ ад яго кветкі, стаўляе ў вазу.*

**Людміла Міхайлаўна.** Знаёміць вас не трэба?

*Госці рассаджваюцца вакол стала.*

**Пісьменнік** *(акурат устрывожана).* І што, вось так, не будзем чакаць імянінніка?
**Людміла Міхайлаўна** *(какетліва).* І не будзем, Павел Дзямідавіч!
**Пісьменнік.** Што вы тут чыталі?
**Анатоль Іванавіч.** Біблію.
**Пісьменнік.** Раней да Маркса звярталіся, да Леніна.
**Анатоль Іванавіч.** Можа, таму, што пра Біблію забылі?
**Пісьменнік.** Я пра Біблію ніколі не забываў. Пісьменнік без Бібліі, можна сказаць, нішто. Іншая справа, што спасылкі на Біблію ў мяне выкрэслівалі. А вы што, Анатоль Іванавіч, у галіне багаслоўя практыкуеце?

**Анатоль Іванавіч.** Я – гісторык. Да гэтага мы проста часам гаварылі па Бібліі, але не ўпаміналі яе.

*Гаспадыня ляскае відэльцам па бутэльцы.*

**Людміла Міхайлаўна.** Павел Дзямідавіч, за вамі першае слова.

**Пісьменнік.** Тост без імянінніка?

**Людміла Міхайлаўна.** Думаю, Левановіч не пакрыўдзіцца.

**Пісьменнік.** Гэты наш Левановіч... Анекдот. Толькі навошта мне ўдзельнічаць у гэтым анекдоце?

**Антаніна.** Вы скажыце свой тост, а ўсё астатняе пойдзе як трэба.

**Пісьменнік.** Ну, то... за нашага імянінніка. Няхай яму...

**Даўгучыц** *(да пісьменніка).* Што там на з’ездзе былое пасля?

**Пісьменнік.** Калі вы пайшлі?

**Даўгучыц.** Пасля вашага выступлення.

**Пісьменнік.** Значыць, з’езд прайшоў без вас. Адбыліся выбары. Я больш не сакратар. Супроць мяне прагаласавала адна чацвёртая частка членаў Саюза пісьменнікаў. Пасля гэтага сакратар ЦК сказаў мне, што сакратарыят ЦК рашыў не рэкамендаваць мяне.

**Даўгучыц.** Але па вас не відаць, што вы апынуліся без пасады?

**Пісьменнік.** Па дарозе сюды супакоіўся. Падумаў, што трэба рыхтавацца да старасці. Усё роўна калісьці давядзецца пра гэта дбаць. Пісьменнік павінен думаць увесь час пра старасць.

**Антон Іванавіч.** Гм, а мне здавалася, што ваш брат заўсёды павінен быць маладым.

**Пісьменнік.** Гэта вам сапраўды так здавалася. Бо, мусіць, не ведаеце, што азначае кабэжэ?

**Анатоль Іванавіч.** Звычайная абрэвіятура, і нічога больш.

**Пісьменнік.** Гэта, дарагі мой Анатоль Іванавіч, расшыфроўваецца так: калі буду жывы. Леў Талстой з самае маладосці ў дзённіках сваіх гэтак пісаў, загадваючы нешта наперад. І яшчэ ён часта гаварыў – пабойся бога, бо паміраць жа давядзецца.

**Антаніна.** Нешта ў нае сёння... дзе той гаспадар?

**Пісьменнік.** Дзіўна было б, калі б ён цяпер знаходзіўся тут.

**Людміла Міхайлаўна** *(устрывожана).* Як гэта?

**Пісьменнік.** Радыяцыя павышаная. Сёння ўвесь дзень пра гэта на з’ездзе шапталіся. Кажуць, заходнія радыёстанцыі перадаюць.

**Вальдэмар.** Цікава, пры павышанай радыяцыі гэта дазваляецца ўжываць? *(Бярэ са стала пляшку, ляпае другой рукой па шкле).*

**Даўгучыц.** Па ўсім відаць, дарэмна мы пачыналі без гаспадара. Прафесар ужо б дакладна адказаў на такое пытанне.

**Людміла Міхайлаўна** *(гэтак жа ўстрывожана).* Ладна, памаўчыце-тка! *(Да пісьменніка).* Павел Дзямідавіч, а калі сур’ёзна? Што там буржуі перадаюць?

**Пісьменнік.** Далібог, Людзміла Міхайлаўна, дакладна нічога не ведаю. Заняты быў увесь дзень з’ездаўскімі інтрыгамі. Але...

*Звоніць тэлефон. Гаспадыня ўскоквае, бяжыць у калідор. Тады гукае адтуль.*

**Людміла Міхайлаўна.** Андрэй, гэта цябе!

*Андрэй вылазіць з-за стала, выходзіць. З ім у калідоры застаецца і нявестка.*

**Андрэй** *(бярэ трубку).* Так, я. *(Слухае).* Так точна. Выязджаю. *(Кідае трубку).*

**Людміла Міхайлаўна.** Што гэта значыць – выязджаю?

**Андрэй.** А тое, Людзміла Міхайлаўна, што кароткатэрміновы адпачынак мой, здаецца, ляснуў. Выязджаю кіеўскім цягніком да месца службы. Уранні павінен быць у часці.

**Людміла Міхайлаўна.** Што-небудзь здарылася?

**Андрэй.** Хто ж пра гэта па тэлефоне скажа? Так што абнімі за мяне брата. Няхай даруе, што не дачакаўся.

**Людміла Міхайлаўна.** Ты ж хоць паспееў перакусіць? Ці яшчэ пасядзіш?

**Адрэй.** Загад ёсць загад – трэба ехаць. Неадкладна.

**Людміла Міхайлаўна.** Як жа яны цябе знайшлі?

**Андрэй.** Мае адрасы па ўсім ланцугу, дзе бываю. Справа не хітрая і даволі дэталёва адпрацаваная. Я вось думаю, як мне зрабіць – ці то па-англійску знікнуць, ці то развітацца з гасцямі.

**Людміла Міхайлаўна.** Ідзі пакажыся.

*Айдрэй вяртаецца да гасцей. За ім ідзе Людзміла Міхайлаўна.*

**Андрэй.** Мушу пакінуць вас, дарагія таварышы...

**Вальдэмар.** Сабутыльнікі...

**Андрэй.** А хоць бы і так. З прыемнымі людзьмі нават горкую гарэлку салодка піць.

**Антаніна.** Фу, Андрэй Сямёнавіч... Штосьці на вас не падобна гэта... Горкую гарэлку... піць... Вы лепей скажыце, што здарылася? Бамбяць?

**Андрэй** *(усміхаючыся).* Увогуле – гэта ваенная тайна. Але і не бамбяць, і не страляюць. Служба. Спатрэбіўся на службе.

**Анатоль Іванавіч.** Ну вось. Выйшла, аказваецца, на праўду. Як гэта ў пісанні?

**Антаніна** *(да Андрэя).* І часта з вамі такое здараецца? Ну, што раптам выцягваюць з-за стала?

**Вальдэмар.** Абы не з пасцелі...

**Антаніна.** Памаўчаў бы!.. Не шкодзіла б, каб цябе таксама іншы раз вось гэтак!..

*Антаніна падыходзіць да лётчыка, цалуе. За ёй падыходзяць развітацца Вальдэмар, Даўгучыц... Адзін пісьменнік сядзіць панура за сталом і не кратаецца. «Шчасліва вам», – кажа Андрэй, выходзячы з пакоя. Гасне святло.*

## К А Р Ц І Н А  I I

*Прыцемак так і застаецца ў апусцелай кватэры Левановічаў,.*
*Ціха адчыняюцца дзверы, заходзіць гаспадар Эдуард Левановіч.*
*Гаспадар уключае святло, бачыць – на стале, як кажуць, папіта і паедзена.*
*На канапе ляжыць Даўгучыц. Ад зыркага святла прачынаецца,*

**Даўгучыц.** Нарэшце і гаспадар стыкнуўся на двор.

**Левановіч.** Бачу, і без мяне тут справіліся.

**Даўгучыц.** Нездарма ж кажуць – калі Магамет не ідзе да гары, то гара ідзе да Магамета. Вось і мы...

**Левановіч.** Памалацілі. Як на таку цапамі. Ты дык ажно ўхадокаўся, бачу.

**Даўгучыц.** Ты не дужа накідвайся. Я ў Людзмілы Міхайлаўны папрасіўся заначаваць. Сам ведаеш, дабірацца мне далёка. Дый...

**Левановіч** *(усміхаецца).* Якраз вось у гэтым «дый...» і скрыта ўсё.

**Даўгучыц.** А што ж рабіць скажаш, калі мне ў жыцці ўвогуле не шанцуе? Я ў цябе нават у туалет не грэбую хадзіць. Бо чэхаславацкі. А ў маім трэба стаяць пасля ўсяго над унітазам і падчышчаць, Ну, словам... Дый канапа мая дзіравая стала. Урэшце, не без тваё дапамогі, ты ж сам некалі спаў на ёй, калі не было куды падзецца.

**Левановіч.** Сапраўды, канапа ў цябе мулкая. Застаецца толькі дзівіцца, чаму не заменіш?

**Даўгучыц.** Прывычка, Эдуард Сямёнавіч, прывычка. Ну, што з таго выйшла, што жонку памяняў?

**Левановіч.** Бачу, так і напрошваешся, каб шкадавалі? Без гэтага жыць не можаш. Але за гэта калі-небудзь і пабіць могуць.

*Адчыняюцца дзверы з другога пакоя. Выходзіць у халаце Людміла Міхайлаўна.*

**Людміла Міхайлаўна** *(да мужа).* Я так і не разумею – ты гэта дзівачыш, ці што здарылася?

**Левановіч.** Дзе Андрэй?

**Людміла Міхайлаўна.** Выклікалі ў часць. Дарэчы, што ў яго за служба? Лётчык, а...

**Левановіч.** Лётчык. Але служыць у камандзе так званай «кліматычнай вайны».

**Людміла Міхайлаўна.** Ладна. Але чаму ты не гаворыш, дзе ты быў на свой дзень нараджэння?

**Левановіч.** На рабоце. На Чарнобыльскай атамнай станцыі аварыя.

**Даўгучыц.** Што гэта значыць?

**Левановіч** *(сядае).* Тое, што ў нас таксама павышаная радыяцыя.

**Даўгучыц.** Калі гэта здарылася?

**Левановіч.** Учора.

**Даўгучыц.** Заходнія радыёстанцыі ўжо на ўсе галасы распавядаюць.

**Людміла Міхайлаўна.** Ну і што ж будзе?

**Левановіч.** Не ведаю. Пакуль справа засакрэчваецца. Але радыяцыя вялікая. У нас зашкаліла ўсе прыборы. Ёсць чуткі, што адзін з чатырох блокаў узарваўся.

**Даўгучыц.** Гэта ж раўнасільна некалькім атамным бомбам!

**Левановіч.** Так... Па радыяцыі...

**Людміла Міхайлаўна.** Штосьці я не разумею. Пачакайце. Чарнобыль?.. Гэта ж недалёка, за некалькі кіламетраў ад нашай вёскі?! Там жа маці! Эдзік, там жа мая маці?!

**Левановіч.** Я званіў у раён. Не дазваніўся.

**Людміла Міхайлаўна.** О-о божа!.. *(Ідзе ў калідор да тэлефона).*

**Даўгучыц** *(да Левановіча).* Раскажы падрабязна: што здарылася, чаму?

**Левановіч.** Ніхто нічога не ведае. На ўсё наклала руку Масква. Але мы дазваніліся знаёмаму акадэміку – па яго словах выходзіць, што на станцыі ажыццяўлялі нейкі эксперымент.

**Даўгучыц.** Якія могуць быць на атамнай станцыі эксперыменты? Спярша падарункі рабілі да дваццаць сёмага з'езда партыі, цяпер, бачыш, эксперымент. Вось і збылося прадказанне, хочаш вер, хочаш не вер. Мы тут, пакуль чакалі цябе, Біблію чыталі: Чарнобыль – гэта палын. Род палыну. Вось і выбухнула палын-зорка. Што ж цяпер будзе, Эдуард Сямёнавіч?

**Левановіч.** Спытай пра што-небудзь лягчэйшае.

**Даўгучыц.** Але ж ты вучоны... энергетык...

**Левановіч.** А там даўно стаў палітыкай. Вось і цяпер справу бяруць у рукі палітыкі. Мы пачынаем даводзіць, што гэта вельмі небяспечна – выбух атамнага блока, а нам цыц, не панікуй! Я ўспамінаю сваё дзяцінства. Фронт у сорак першым затрымаўся на Бесядзі, на самым краі Беларусі, на паўднёвым усходзе. А Смаленск ужо к таму часу паў. Дык у нас мужыкоў палохалі за тое, што пра гэта расказвалі, што Смаленск здалі. Моў, панікёры, і ўсё тут. Аказваецца, кіраўнікі нашы нічому не навучыліся. Усё паўтараецца. Не ў тых формах, дык у гэтых, але паўтараецца.

**Даўгучыц.** Дык што ж будзе?

**Левановіч.** Бяда будзе, вось што! Катастрофа. Чарнобыльская радыяцыя ўжо над Скандынавіяй. Можаш уявіць, што робіцца вакол станцыі.

**Даўгучыц.** Можа...

**Левановіч.** Што – можа?

**Даўгучыц.** Я падумаў, можа, трэба ўцякаць куды...

**Левановіч.** Ад радыяцыі? Тым больш што межаў распаўсюджання яе пакуль ніхто не ведае. Цэлы дзень сёння мы спрабавалі штосьці даведацца, удакладніць, але дарэмна. Далей свайго інстытута не здолелі прабіцца.

**Даўгучыц.** Але Чарнобыльская станцыя на Украіне. Што ўкраінцы?

**Левановіч.** Абстаноўка амаль такая ж... Ніхто дакладна нічога не ведае. Але некаторыя дзівакі радуюцца, што вецер учора дзьмуў не ў іх бок.

**Даўгучыц.** Гэта як у анекдоце. Але ж учора на нас, заўтра – на іх. Дарэчы, а які вецер сапраўды ўчора быў?

**Левановіч.** Паўночна-заходні.

**Даўгучыц.** Значыць, сапраўды на нас дзьмуў?

**Левановіч.** Выходзіць, так.

*Заходзіць гаспадыня.*

**Людміла Міхайлаўна.** Эдзік, я ніяк не магу дазваніцца!

**Левановіч.** Куды ты звоніш? У маці ж тваёй тэлефона няма.

**Людміла Міхайлаўна.** Затое ў школе ёсць. Ды і ў саўгаснай канторы тэлефоны стаяць ледзь не ў кожнага.

**Левановіч.** Не старайся дарэмна. Туды цяпер не прабіцца. Да таго ж ноч. Заўтра нашы вучоныя едуць на месца здарэння. У Чарнобыль. Так што...

**Людміла Міхайлаўна** *(з неўразуменнем глядзіць на мужа).* Што – так што?

**Левановіч.** Тое, што я таксама еду. Адтуль пазваню ў раён. І ў вёску, да маці. І табе сюды. Супакойся.

**Людміла Міхйлаўна.** Пра што ты гаворыш? Як я магу супакоіцца? У мяне ж там маці!

**Левановіч.** Ну і што?

**Людміла Міхайлаўна.** А тое, што твая маці далёка...

**Левановіч.** Так, мая паспела памерці.

**Людміла Міхайлаўна.** Ты гаворыш так, быццам рады гэтаму?

**Левановіч.** Не крычы! Я стаміўся. Я вось вып'ю шклянку ды лягу.

**Людміла Міхайлаўна.** Ну так, табе што? Тваёй маці небяспека не пагражае.

*Левановіч уздыхае: «Не губляй галавы». Даўгучыц налівае яму чарку, тады сабе: «Тваё здароўе!» Левановіч п'е моўчкі, затым налівае сам, зноў п'е і не бярэ нічога ў рот.*

**Людміла Міхайлаўна.** Калі вы едзеце?

**Левановіч.** Заўтра. Мне пазвоняць.

**Людміла Міхайлаўна.** Я з табой таксама паеду.

**Левановіч.** Туды, Люся, едуць спецыялісты. А не іх жонкі.

**Людміла Міхайлаўна.** А ў мяне там маці!

**Левановіч.** Ну супакойся, супакойся!

**Людміла Міхайлаўна.** Як гэта можна, што ніхто нічога не ведае?

**Левановіч.** Чаму ж не ведаем? Ведаем, што ўзарваўся блок на Чарнобыльскай станцыі. Адсюль і вынікі. Ледзь не ваеннае становішча.

**Людміла Міхайлаўна.** Я заўсёды баялася тваёй работы. Вось яна і паказала сябе.

**Даўгучыц.** Людзміла Міхайлаўна, пры чым тут Эдуард Сямёнавіч? Станцыю ў Чарнобылі не ён будаваў, не ён эксплуатаваў.

**Левановіч.** І не я праектаваў.

**Людміла Міхайлаўна.** Усе вы!.. Вунь Аляксандраў ледзь не пад ложкам у сябе збіраўся ставіць рэактар. А цяпер? Дзе ваш Аляксандраў? Словам, я еду на Палессе.

**Левановіч.** Што табе рабіць на Палессі?

**Людміла Міхайлаўна.** Там у мяне маці. Трэба забраць адтуль, калі яшчэ жывая.

**Даўгучыц** *(да Левановіча).* Няхай едзе. Якое ёй жыццё цяпер? Адна трывога. А я ўсё-ткі паспрабую дабрацца ў свой мікраараён. Можа, дзе-небудзь таксі падхаплю.

**Левановіч.** Я ж не ведаў, што ты ў нас заначаваў, а то б машыну не адпускаў.

**Даўгучыц.** Дарэчы, засцерагчыся ад радыяцыі можна?

**Левановіч.** Практычна? Не. Трэба пакідаць заражаную тэрыторыю. А ўвогуле... Ніхто не гатовы да гэтай заразы.

**Даўгучыц.** Я так разумею, што... Словам, ратуйся не ратуйся, а канец вядомы. Ну, бывайце, таварышы Левановічы. Калі спатрэблюся – звaніце. *(Выходзіць).*

**Людміла Міхайлаўна** *(да мужа).* А гэта сапраўды страшна?

**Левановіч.** Што – гэта?

**Людміла Міхайлаўна.** Ну...

**Левановіч.** Страшней не бывае.

*У кватэры зноў паціху настае змрок.*

## К А Р Ц І Н А  І І І

*Падраздзяленне так званай «кліматычнай вайны». Чаму «так званай»? Проста ў 1986 годзе гэтай ці то вайсковай, ці то грамадзянскай авіячасці яшчэ не было знойдзена дакладнай назвы. Часам называлі і так – «вайна са стыхіяй». Відаць, гэта і цяпер недакладная назва. Над картай, што на стале ў назіральнай вышцы, схіліліся вайскоўцы: камандзір падраздзялення, два капітаны.*

**Камандзір падраздзялення.** Бяда ў тым, што нашы самалёты – звычайныя машыны. Яны не прыстасаваны да такой работы. Лётчык нічым не абаронены ў небе ні знізу, ні з бакоў ад радыяцыі. Таму можна толькі ўяўляць, колькі мілірэнтгенаў кожны з нас атрымлівае ў гэта месца за адзін палёт. *(Ляпае ніжэй спіны).*

**Капітан-І** *(смяецца).* Гэта вы вельмі дакладна, таварыш палкоўнік. І жывапісна.

**Капітан-ІІ** *(панура ківае галавой).* Мала смешнага ў тым, што хтосьці нячутна і нябачна свідруе табе задніцу. *(Да палкоўніка).* А што, калі нашым лётчыкам браць з сабой свінцовыя пласціны.

**Камандзір падраздзялення** *(падахвочвае гаварыць).* Ну-ну!..

**Капітан-ІІ.** Каб класці на сядзенне, пад тую ж задніцу.

**Камандзір падраздзялення.** А з бакоў? Што з бакоў пакладзем?

**Капітан-І.** З бакоў пакуль нічога не прыдумалі класці.

**Камандзір падраздзялення.** Якая бездапаможнасць! Век атама, але як абараніць ад радыяцыі чалавека, ніхто не ведае. Вучоныя, маць іх так!

Панахапалі зорак на грудзі, некаторыя сталі падобныя на выставачных выжлаў. Усё ў імя чалавека, усё на карысць народу. Дзе ж яна, тая карысць?

**Капітан-І.** Самі-то яны для сваёй працы на рэактарах нейкія даспехі вынайшлі... У кіно паказваюць.

**Капітан-ІІ** *(да палкоўніка).* Ці праўда, што на Чарнобыльскай АЭС рабіліся нейкія эксперыменты?

**Камандзір падраздзялення.** Чорт іх ведае! Але ўсё можа быць. Я мяркую па тым, як пісалі, здаецца, у лютым, «Известия» пра гэту станцыю. Дзіўна, як можна калектыву новай атамнай станцыі браць высокія абавязацельствы? Гэта значыць – працаваць за норму. Вось і атрымалі падарунак да з’езда, вось і шандарахнула, маць іх!..

**Капітан-І** *(глядзіць на гадзіннік).* Недзе ўжо Леванові̇ч павінен падлятаць...

**Камандзір падраздзялення.** Хто ў нас нас наступны?

**Капітан-П.** Старшы лейтэнант Войцік.

**Камандзір падраздзялення.** А пра свінцовыя пласцінкі вы, відаць, правільна. Як кажуць, на бязрыб’і і рак рыба. Тым больш што прынцып правільны. Усё-ткі свінец. Трэба звярнуцца ў інстытут. *(Бярэ трубку тэлефона, набірае нумар).* Алё...

**Капітан-ІІ.** Не, таварыш палкоўнік, свінцовыя пласцінкі нам могуць зрабіць у іншым месцы. Я ведаю...

**Камандзір падраздзялення.** Вам і карты ў рукі, капітан, калі ўжо сапраўды ведаеце, дзе гэта могуць зрабіць. Але ж дарагая лыжка к абеду. Не забывайце.

*На вышку ў лётным камбінезоне з авіяшлемам у руцэ заходзіць Андрэй Левановіч.*

**Андрэй** *(робіць стойку «смірна»).* Таварыш палкоўнік!...

**Камандзір падраздзялення.** Не да фармальнасцей. Сядайце, старшы лейтэнант, расказвайце. Горача там?

**Андрэй** *(сядае).* Горача, таварыш палкоўнік. Чацвёрты блок станцыі ўсё яшчэ ў агні.

**Камандзір падраздзялення.** Чым яго тушаць?

**Андрэй.** Як я зразумеў, пяском з верталётаў. Сёння на даху рэактара людзей ужо не відаць.

**Камандзір падраздзялення.** А што ў Прыпяці?

**Андрэй.** Спакойна. І ўвогуле, калі глядзець на зямлю з вышыні, то ўражанне, таварыш лалкоўнік, дзіўнае – быццам нічога страшнага не здарылася. На Украіне – сады ў квецені, пасвіцца жывёла, на палях – трактары...

**Камандзір падраздзялення.** І ніякіх адзнак? Ну, знешніх?

**Андрэй.** Здаецца, лясы ў Беларусі жаўцеюць...

**Камандзір падраздзялення.** Дзіва што!.. Значыць, верталёты ў Чарнобылі працуюць?

**Андрэй.** Так точна, таварыш палкоўнік.

**Камандзір падраздзялення.** А мы адно назіраем ды атрымліваем кожны сваю дозу радыяцыі. Як ваш дазіметр?

**Андрэй.** Ён не разлічаны на такую дозу. Тут трэба буржуйскі.

**Камандзір падраздзялення.** Нават з гэтым да капіталістаў трэба з паклонам ісці. Добра, старшы лейтэнант, пішыце справаздачу аб палёце і адпачывайце. Сёння ў вас, здаецца, яшчэ адзін вылет?

**Андрэй.** Так точна, таварыш палкоўнік.

**Камандзір падраздзялення.** Дарэчы, як вы адчуваеце сябе пасля палёту?

**Андрэй.** Ужо на сон хіліць.

*Палкоўнік доўга глядзіць на Андрэя, пасля пераводзіць усё роўна як здранцвелы позірк на Капітана-ІІ, Капітана-І...*

*Гаворыць радыё: «Ад Савета Міністраў СССР. Як паведамлялася ў друку, на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, размешчанай за сто трыццаць кіламетраў на поўнач. ад Кіева, адбылася аварыя. На месцы працуе ўрадавая камісія... У яе састаў увайшлі кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, вядомыя вучоныя і спецыялісты. Паводле папярэдніх дадзеных, аварыя адбылася ў адным з памяшканняў чацвёртага энергаблока і прывяла да разбурэння часткі будаўнічых канструкцый рэактара, яго пашкоджання і некаторай уцечкі радыеактыўных рэчываў...»*

**Капітан-І.** На што-што, а на камісіі мы здатныя.

**Капітан-ІІ.** Раз створана камісія, лічы – канцы ў ваду. Яшчэ ні адна камісія ў нашай краіне не даводзіла народу ні аб прычынах аварыі, ні аб іх выніках. Прынамсі, так, як гэта належыць рабіць.

**Андрэй.** Мяркуючы па тым, што я бачыў з самалёта, справа не ў «частцы будаўнічых канструкцый». Палае ўвесь рэактар.

## К А Р Ц І Н А   I V

*Вясковая вуліца. Калодзеж з жураўлём. Сярод вясковых людзей – Васіль Сцяпанавіч, сакратар партыйнага камітэта. Тут жа ў натоўпе Эдуард Левановіч і яго жонка Людміла Міхайлаўна.*

**Васіль Сцяпанавіч** *(да сялян).* Няварта хвалявацца, таварышы хлебаробы. Абком партыі валодае сітуацыяй. Старшыня аблвыканкома паехаў у Мінск...

**Селянін-І.** Сітуацыяй, дарагі таварышок, валодаць можна. Толькі як яе разумець? У вас валодаць сітуаціяй – гэта засцерагчы народ, як вы кажаце, ад панікі. А ў нас – ведаць сёння дакладна, што нам пагражае і што рабіць? Во мужыкі кажуць, што гэта страшней за атамную бомбу, нават за ядзерную.

**Васіль Сцяпанавіч.** Глупства. Самі ж бачыце. Калі амерыканцы скінулі бомбы над Японіяй, там гінулі людзі. А ў нас?

**Селянін-ІІ.** Дак у нас пакуль... Мы пакуль, і праўда, жывыя.

**Васіль Сцяпанавіч.** І будзеце жыць.

**Селянін-ІІІ.** Але ж, кажуць, радыяцыя?

**Васіль Сцяпанавіч.** Ну, выпаў ёд. А вы ведаеце перыяд распаду ёду?

**Селянін-І.** Ну, што такое ёд, мы, здаецца, ведаем. Але вось як ён выпадае і распадаецца?..

**Васіль Сцяпанавіч.** То паслухайце. Ён нават карысны для чалавечага арганізма. Недахоп ёду выклікае базедавую хваробу.

**Селянін-І.** Дапусцім – гэта можна зразумець, дарагі таварышок. Але ж, відаць, і ёд, калі залішне, стане шкодным?

**Васіль Сцяпанавіч.** Ну якая шкода ад яго? Вось глядзіце. *(Бярэ вядро за вушкі, заводзіць яго над калодзежам, апускае на жураўлі ўніз, дастае ваду; нагінае аберуч вядро, са знарочыстым смакам п'е).* Вось бачыце – я, ваш сакратар, п'ю і зусім не баюся.

**Селянін-І.** Але скажыце, таварыш сакратар, якая каманда нам паступіць?

**Васіль Сцяпанавіч** *(разводзіць рукамі, ляпае імі па грудзях сабе).* Ну якая вам яшчэ патрэбна каманда, скажыце, калі партыя з вамі? Будзем займацца, як і заўсёды, сваім адвечным клопатам. А які ў нас з вамі цяпер клопат?

**Селянін-ІІ.** Самі ж бачыце...

**Васіль Сцяпанавіч.** Не, вы не так зразумелі мяне, дарагі таварыш. Трывога – гэта адно, а клопат... Вясна, трэба засяваць зямлю. Так што пагаманілі, і хопіць. Пара разыходзіцца ды ў поле ехаць.

**Селянін-І.** Значыць, не трывожыцца?

**Васіль Сцяпанавіч.** Я ж кажу, трывога – гэта адно, а клопат...

**Селянін-І.** Але ж, дарагі таварышок, я сёння слухаў замежнае радыё...

**Васіль Сцяпанавіч.** А навошта слухаеш яго? Спаў бы, як усе добрыя людзі. Мне вось няма калі слухаць замежнае радыё.

*Сяляне вакол смяюцца. Але ж і разыходзіцца пачынаюць ад калодзежа.*
*На месцы застаюцца тры чалавекі – Васіль Сцяпанавіч, Эдуард Леванович*
*і яго жонка Людміла Міхайлаўна. Сакратар нарэшце бачыць іх,*
*радасна імкне насустрач.*

Вы ціхенька стаіце за спінамі калгаснікаў, а я не бачу. Добры дзень, Эдуард Сямёнавіч.

**Леванові ч** *(падае руку).* А гэта мая жонка, Васіль Сцяпанавіч.

**Васіль Сцяпанавіч** *(вітаецца з ёю).* Добры дзень, добры дзень. Я гэта міма праязджаў, бачу – мужыкі тоўпяцца, ну я і спыніўся па звычцы. Паразмаўлялі вось. А як вы тут апынуліся?

**Левановіч.** Быў у Чарнобылі на атамнай станцыі. Людміла Міхайлаўна тым часам прыехала да маці.

**Людміла Міхайлаўна.** Прыехала ратаваць.

**Васіль Сцяпанавіч.** Ад чаго ратаваць трэба? Жыве сярод людзей. Дарэчы, у гэтай вёсцы ваша маці жыве?

**Людміла Міхайлаўна.** Не. Мы тут таксама праездам. Маці жыве на беразе Прыпяці..

**Васіль Сцяпанавіч** *(хмурыць лоб).* Гэта іншая справа. Але ж ці абавязкова ехаць вам туды? *(Глядзіць на Левановіча).* Мы можам сюды прывезці вашу маці. Зараз вось пазваню ў раён, і яе прывязуць разам з усім скарбам.

**Людміла Міхайлаўна.** Дзякуй, але я сама хачу паехаць у вёску. Можа, апошні раз.

**Васіль Сцяпанавіч.** Што вы ўсе лямантуеце?!

**Левановіч.** Няхай едзе. Тым больш што машына ў нас ёсць. Ды і да вёскі ўжо не дужа далёка.

**Васіль Сцяпанавіч.** Як ведае. А вы, Эдуард Сямёнавіч?

**Левановіч.** Мне хутчэй трэба ў Мінск. Справы.

**Васіль Сцяпанавіч.** Магу машыну даць.

**Левановіч.** Не трэба, падкінеце да аэрапорта.

**Васіль Сцяпанавіч.** Як жадаеце.

*Людміла Міхайлаўна развітваецца. Адыходзіць.*

Што ў Чарнобылі?

**Левановіч.** Катастрофа.

**Васіль Сцяпанавіч.** Што значыць – катастрофа? Аварыя?

**Левановіч.** Завіце як хочаце. Але небяспека ад гэтага не змяншаецца.

**Васіль Сцяпанавіч.** Ці хутка справяцца з аварыяй?

**Левановіч.** З самой аварыяй, можа, і хутка, аднак з вынікамі яе... Думаю, што ніколі.

**Васіль Сцяпанавіч.** Як вас разумець?

**Левановіч.** Вось вы зараз гаварылі людзям пра ёд. Але ж ёд – гэта першае, што выразна выявілася пасля выбуху. За ёдам дадуць аб сабе знаць цэзій, стронцый, плутоній... А тэрмін распаду гэтых рэчываў, – стагоддзі, ва ўсякім выпадку, стронцыя і плутонія.

**Васіль Сцяпанавіч.** Вы не перабольшваеце, Эдуард Сямёнавіч?

**Левановіч.** Гэта элементарна, Васіль Сцяпанавіч. Пра гэта студэнты ведаюць.

**Васіль Сцяпанавіч.** А што стронцый і плутоній у нас выпалі – гэта ўжо дакладна?

**Левановіч.** Мяркуючы па тым, на якім паліве працавала станцыя, можна лічыць, што так. Зямля вакол станцыі захварэла навекі. Іншая справа, на колькі далёка разнёс выбух гэтыя страшныя рэчывы. А яшчэ трэба ўлічваць вецер, аблокі. Так што...

**Васіль Сцяпанавіч.** А чалавеку? Як тады чалавеку жыць тут?

**Левановіч.** Нельга.

**Васіль Сцяпанавіч.** Выходзіць?..

**Левановіч.** Самае небяспечнае цяпер падманваць сябе, Васіль Сцяпанавіч.

**Васіль Сцяпанавіч.** Ды што мы? Я гатовы хоць...

**Левановіч.** Падманваючы сябе, мы будзем падманваць народ.

**Васіль Сцяпанавіч.** Вы асуджаеце, што я гаварыў тут людзям?

**Левановіч.** Бадзёрасць не заўсёды на карысць справе. Кажуць, што яшчэ не адменены майскія дэманстрацыі?

**Васіль Сцяпанавіч.** Не. Вы раіце адмяніць? Але ў Мінску пра гэта не хочуць і слухаць. Першы сакратар настойвае. Ды і я, па праўдзе кажучы, нічога не бачу... Так, нічога не бачу...

**Левановіч.** Не губіце народ, Васіль Сцяпанавіч.

**Васіль Сцяпанавіч.** Але ж паніка... Не выведзем народ на вуліцы – пачнецца яшчэ большая паніка. Значыць, сапраўды штосьці страшнае здарылася...

**Левановіч.** Няхай народ ведае, што яму пагражае. І няхай хутчэй уцякае адсюль. Не супакойвайце і не затрымлівайце. Памагайце выязджаць з гэтай зоны.

**Васіль Сцяпанавіч.** Лёгка сказаць – няхай уцякае. Вы ўяўляеце сабе, што тут пачнецца? Страшней, чым у вайну.

**Левановіч.** Але вораг у народа цяпер страшнейшы, чым у вайну, дарма што нябачны.

**Васіль Сцяпанавіч.** А можа, яшчэ не ўсё так страшна, як вы палохаеце?

**Левановіч.** Я – вучоны, Васіль Сцяпанавіч. Людзям трэба сказаць праўду пра чарнобыльскую катастрофу.

**Васіль Сцяпанавіч.** Ну, вы таксама, Эдуард Сямёнавіч! Не ўсякая праўда на карысць народу. Ды і не ўсё ад нас тут залежыць. Самі ведаеце. Ёсць Мінск, Масква... Самае галоўнае цяпер – не дапусціць панікі. Разабрацца ва ўсім паступова, каб прыняць правільнае рашэнне. А вы – праўду.

**Левановіч.** Я вам сказаў: пашкадуйце народ, Васіль Сцяпанавіч. *(Хоча адыходзіць ад калодзежа).*

**Васіль Сцяпанавіч.** Куды ж вы? Я падвязу. А дагаворым у машыне. *(І ўжо на хаду).* Урэшце, па Чарнобылі працуе ўрадавая камісія. Яна ж нешта пэўнае скажа.

*На слупе ў вёсцы гаворыць радыё: «На Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі працягваюцца работы па ліквідацыі вынікаў ўзнікшай аварыі. У выніку прынятых мер за мінулыя суткі выдзяленне радыеактыўных рэчываў знізілася, Узроўні радыяцыі ў раёне АЭС і ў пасёлку станцыі знізіліся... работа прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў і ўстаноў ідзе нармальна».*

**Левановіч** *(паслухаўшы).* Дзікунства!..

## К А Р Ц І Н А V

*Зноў назіральная вышка ў падраздзяленні «кліматычнай вайны». Тыя ж два капітаны і камандзір падраздзялення.*

**Капітан-ІІ.** Няўжо гэтыя аблокі каму-небудзь пагражаюць? Ну і няхай плывуць сабе над усёй краінай на Ледавіты акіян!

**Камандзір падраздзялення.** Загадана рассеяць.

**Капітан-І.** Няхай бы градабойнымі зеніткамі рассейвалі.

**Камандзір падраздзялення.** Загадана цяжкім алюмініем з самалёта.

**Капітан-ІІ.** Значыць, аблокі пагражаюць Маскве? Я так думаю?

**Камандзір падраздзялення.** Пры чым тут Масква! Загадана спыніць прасоўванне іх на ўсход, і мы павінны спыніць. Мы ваенныя людзі, дарагія мае капітаны.

*Колькі часу вайскоўцы сядзяць моўчкі. Тады зноў пачынаюць размаўляць.*

**Капітан-І.** Мяркуючы па метэакарце, аблокі рухаюцца з Чарнобыля.

**Капітан-ІІ.** Хутчэй, што так...

**Капітан-І.** Значыць, яны радыяцыйныя? І Андрэю з Іванам зноў давядзецца ляцець у гэтай заразе? І нашы свінцовыя падкладкі ім не дапамогуць?

**Капітан-ІІ.** Але ж... Таварыш палкоўнік!..

**Камандзір падраздзялення.** Ды чую я!..

**Капітан-ІІ.** І што вы на гэта скажаце, дазволю спытаць?

**Камандзір падраздзялення.** Загад, таварышы капітаны, загад! А то можна падумаць, што вы не тую прафесію сабе ў жыцці выбралі?

*Пстрыкае мікрафон на стале:*
*«Зорка, я – Коршак, Зорка, я – Коршак. Чуеце мяне?»*

**Камандзір падраздзялення.** Так, мы чуем вас, «Коршак». Дзе вы знаходзіцеся, старшы лейтэнант Левановіч?

**Голас Андрэя.** На ўсходняй кромцы аблокаў. Над Тулай неба ўжо чыстае. Затое на захад, над Беларуссю, зямля заслонена спрэс.

**Камандзір падраздзялення.** Коршак, Коршак, заданне выконваць гатовы?

**Голас Андрэя.** Так точна, таварыш палкоўнік!

**Камандзір падрадзялення.** Выдатна, старшы лейтэнант. Абстаноўка з часу вашага вылету не змянілася. Мы вам жадаем поспеху.

**Голас Андрэя.** Сувязь спыняю.

*Пстрыкае мікрафон. На вышцы настае цішыня.*

**Капітан-ІІ.** Трагічная зямля. Ці мала ёй дасталося ў гісторыі!.. А цяпер – Чарнобыль зацярушвае атрутай.

**Капітан-І.** Не зайздрошчу я Левановічу.

**Камандзір падраздзялення.** Чаму ж не выручыў, сам не паляцеў?

*Зной пстрыкае мікрафон: «Зорка, Зорка, я – Сокал. Адкажыце!»*

**Камандзір падраздзялення.** Дзе вы знаходзіцеся, Сокал?

**Голас лётчыка.** Выйшаў на край аблокаў з боку Бранска.

**Камандзір падраздзялення.** Атакуйце аблокі!

**Голас лётчыка.** Ёсць атакаваць аблокі!

**Камандзір падраздзялення** *(шчоўкае выключальнікам).* Усіх не выручыш, капітан. Да таго ж, мы на вайсковай службе. І кожны займае сваё месца. Сёння старшы лейтэнант Левановіч і капітан Аляксееў выконваюць баявую задачу, я паўтараю – баявую, а заўтра настане чарга іншым.

# ДЗЕЯ ДРУГАЯ

## К А Р Ц І Н А V I

*Зноў кватэра Левановічаў. Ціха працуе тэлевізар. У кватэры – тыя ж госці, што і калісьці, у 1986 годзе: Вальдэмар, Антаніна, Даўгучыц, Анатоль Іванавіч, Андрэй Левановіч; гэты раз дома гаспадар, Эдуард Левановіч; гаспадыня Людміла Міхайлаўна завіхаецца каля стала. Вечар таксама ў гонар гаспадара, які пастарэў на некалькі гадоў. Але стол гэты раз накрыты меншы, няйначай, аля фуршэт.*

**Даўгучыц** *(пацірае рукі).* Даўно мы не збіраліся ў вас, Людміла Міхайлаўна, даўненька.

**Людміла Міхайлаўна.** І то праўда, даўно. Можа, таму, што апошні раз сустракаліся ў нядобры час.

**Даўгучыц.** Так, то быў, здаецца, яшчэ застойны час, але застольны.

**Людміла Міхайлаўна.** Што застольны, то застольны. Гэта праўда. Але я не пра тое.

**Даўгучыц** *(да Андрэя).* Скажыце, Андрэй, у вас гарэлка таксама па талонах?

**Андрэй.** У нас не гарэлка, у нас – горілка. Але пакуль без горілачных талонаў.

**Антаніна.** Хто гэта ў нас талоны прыдумаў?

**Вальдэмар.** Хто прыдумаў, невядома, а ўвёў гарсавет.

**Даўгучыц.** Справа няхітрая – прыдумаць. Але што гэта пісьменнік наш позніцца? Я так разумею, што мы яго чакаем? Першага тоста няма каму гаварыць, га, Людміла Міхайлаўна? Позніцца ваш кумір.

**Левановіч.** Яго не будзе. Паехаў.

**Даўгучыц.** Куды?

**Левановіч.** На Смаленшчыну. Адтуль цякуць многія нашы рэкі. А Павел Дзямідавіч па вытоках рэк шастае.

**Анатоль Іванавіч.** Чарговы пісьменніцкі заскок

**Левановіч.** Я не стаў бы гаварыць так. Вось скажы. дзе выток Нёмана?

**Анатоль Іванавіч.** Недзе на Уздзеншчыне.

**Левановіч.** Гэта так, але канкрэтна?

**Антаніна.** Што гэта вы, таварышы мужчыны, раптам пра рэкі? Быццам сярод вас няма жанчын?

**Даўгучыц.** Жанчыны-то ёсць, але ж яны пры ўласных мужчынах.

**Антаніна.** Ну, калі падобная акалічнасць вам перапікаджае, то якія ж вы мужчыны?

*Даўгучыц робіць штучны твар, разводзіць рукамі.*

**Анатоль Іванавіч** *(дастае з кішэні часопіс).* Антаніна правільна кажа. Лепей паслухайце. Гэта пра Матроскіна і кампанію. Памятаеце? «Аднойчы кот Матроскін спытаў Шарыка: «Калі б цябе ва ўрад увялі, якім бы ты міністрам захацеў стаць?» – «Я б двума міністрамі адразу стаў, – сказаў Шарык. – Паўдня міністрам рыбнай гаспадаркі, паўдня міністрам палявання». – «А я б, – сказаў кот Матроскін, – я б Гарбачовым стаў». – «Ты што, здурнеў? Глядзі, да чаго ён краіну давёў. Мяса няма, малака няма, яйка на рынку рубель каштуе». – «Эх, Шарык, цямнота ты вясковая. Ды ён усё робіць, каб я разбагацеў. Раней малако было дзешавей за бензін. А зараз я за адзін кілаграм смятаны магу два кілаграмы грошай узяць. Так што, дзякуй яму» – «Ну і што? Што ты са сваімі грашамі рабіць будзеш? У магазінах жа пуста». – «А я, можа, імі сваю печку абклею. Шпалераў жа не прадаюць». – «А я б міністрам КДБ стаў», – сказаў паштальён Печкін. «Кім, кім?» – «Міністрам КДБ. Я б усю краіну заваліў шпіёнамі. Хто ідзе з фотаапаратам, той і шпіён».

**Даўгучыц.** Ці доўга яшчэ ў цябе там?

**Анатоль Іванавіч**. Не падабаецца?

**Даўгучыц.** Ну і часы насталі!.. Яшчэ некалькі гадоў таму мы нясмела, азіраючыся адзін на аднаго, чыталі тут вершыкі пра галоснасць і КДБ, а цяпер...

**Левановіч.** Ну, хопіць, сябры!

**Анатоль Іванавіч.** Зноў рот заціскаюць. А ўсё-ткі хацелася б сёння пачуць, што з нашым імяніннікам адбылося за гэтыя некалькі гадоў.

**Левановіч.** Справаздачы не будзе. *(Бярэ чарку са стала).*

*Падыходзяць іншыя, разбіраюць астатнія чаркі.*

Паколькі нашага выпрабаванага тамады зараз няма, скажу я.

*У гэты момант на экране тэлевізара ўзнікае постаць вучонага.*
*У кватэры з гэтай нечаканасці ўсе смяюцца.*

**Карэспандэнт** *(з экрана).* У сувязі з абмеркаваннем на сесіі Вярхоўнага Савета дзяржаўнай праграмы па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС мы звярнуліся да вядомага вучонага Эдуарда Сямёнавіча Левановіча. Эдуард Сямёнавіч, вы прысутнічалі на першым пасяджэнні. Скажыце...

**Левановіч** *(з экрана).* Важнейшай мэтай праграмы з’яўляецца стварэнне бяспечных для здароўя чалавека ўмоў жыццядзейнасці ў раёнах, якія падпалі пад радыёактыўнае забруджванне.

**Карэспандэнт** *(з экрана).* Многія схільны думаць, што з праграмай урад крыху спазніўся?

**Леванові́ч** *(з экрана).* Не крыху, а моцна. Больш таго, можа, спазніўся ўжо незваротна. Я зыходжу з дадзеных нашай навуковай лабараторыі. Радыёактыўныя рэчывы дасюль распаўсюджваліся ва ўсіх напрамках ад станцыі на значных адлегласцях. Мы адкрылі, што істотнае значэнне, акрамя ёду, цэзію, стронцыю, у забруджванні мелі таксама радыёізатопы цэрыю, ніобію, цырконію, тэлуру, неадэму, нептунію, рутэнію, лантану...

**Карэспандэнт** *(з экрана).* Поўны набор. Пра некаторыя нават чуць не даводзілася.

**Левановіч** *(з экрана).* З ежай, вадой, інгалятарна, праз скуру яны пастаянна пастпалі ў гэтыя гады ў арганізм людзей.

**Карэспандэнт** *(з экрана).* Вы, Эдуард Сямёнавіч, гаворыце так, быццам ужо ўсё ў мінулым – паступалі і гэтак далей.

**Левановіч** *(з экрана).* Апошнія даследаванні ў нас за ўчарашні дзень. Таму я так і гавару – нібыта пра мінулае. Але гэта ўсё самае жахлівае сённяшняе. Паводле нашых дадзеных можна заключыць, што не ёд і цэзій былі асноўнымі дозаўтвараючымі фактарамі для чалавека (акрамя шчытавіднай залозы), а цэлы комплекс радыенуклідаў. Такім чынам, трыццаціпяцібэрная канцэпцыя, якую спрабуюць навязаць, не толькі навукова беспадстаўная і патэнцыяльна небяспечная, але і дэзінфармуе насельніцтва, навуковыя колы, нарэшце, урад.

**Карэспандэнт** *(з экрана).* Чаму вашы даследаванні...

**Левановіч** *(з экрана).* Вы хочаце спытаць – чаму новая методыка, якая магла даўно ўжо ратаваць людзей у так званай чарнобыльскай зоне, адмаўляецца тымі, хто павінен быў распрацоўваць праграму выратавання людзей?

**Карэспандэнт** *(з экрана).* Так.

**Левановіч** *(з экрана).* Думаецца, што зноў у нас навука блытаецца з палітыкай. І гэта нягледзячы на галоснасць, на перабудову. Шматгадовы манапалізм урадавых органаў і імкненне самавольна распараджацца засакрэчанай ісцінай і тут адыгралі і адыгрываюць злавесную ролю. Знаходзячыся на вяршыні сацыяльнай піраміды, кіраўніцтва ў эйфарыі поўнай беспакаранасці ігнаруе і на гэты раз законы прыроды, навязвае дырэктыўныя ўказанні.

**Карэспандэнт** *(з экрана).* Выходзіць, што ўсе гады пасля выбуху ў Чарнобылі народ знаходзіўся ў падмане, дакладней, яму хлусілі?

**Левановіч** *(з экрана).* Можна лічыць, што так.

*Постаць старэйшага Левановіча знікае з экрана, пачынаюцца новыя кадры ў інфармацыйнай праграме. Анатоль Іванавіч падыходзіць, выключае тэлевізар. Ніхто не пярэчыць.*

**Анатоль Іванавіч.** Прабач, Эдуард Сямёнавіч, але я ўжо... Ну, проста не магу ад вашай радыяцыі.

**Вальдэмар.** Ад радыяцыі ці з радыяцыяй?

**Анатоль Іванавіч.** Табе відней. Але ўсё роўна як каростай пакрыўся знутры і звонку. Спадзяёмся, Эдуард Сямёнавіч, ты ў сваёй застольнай прамове не будзеш пра радыяцыю?

**Левановіч.** Не, Анатоль Іванавіч, не палохайся. Я там ужо *(паказвае на тэлевізар)* усё сказаў. Я пра час. Пра тое, аб чым тут ужо гаварылі. Сапраўды, час надзвычай памяняўся. Ты, Анатоль Іванавіч, пародыі чытаў – пра Матроскіна, Шарыка і Гарбачова.

**Анатоль Іванавіч.** Дарэмна вы не захацелі даслухаць. Там яшчэ было і пра Раісу Максімаўну.

**Левановіч.** А мне ўчора расказвалі больш палітычны анекдот. «Які самы адметны крэйсер у нас?» – пытае нехта ў кагосьці. «Аўрора». – «Чаму?». – «Адзін раз стрэліла, а многа гадоў развальваецца». Як бачыш, сапраўды час памяняўся. К добраму ці благому? Дзіўна, але на такое, здавалася б, простае пытанне не кожны бярэцца адказаць. Карэспандэнт у мяне пытаў, вы чулі: няўжо ўсе гэтыя гады пасля Чарнобыля народу хлусілі? Пры самай вялікай галоснасці мы, аказваецца, сапраўды жывём і ў самай вялікай хлусні. Анатоль Іванавіч кажа, што абрыдла слухаць пра радыяцыю. Але што нам з Андрэем, братам маім, рабіць, – ад радыяцыі мы ўжо страцілі сваю радзіму. А страціць малую радзіму – усё роўна, што застацца без вялікай... Я за наша сяброўства, якое...

*Госці цягнуцца да гаспадара з чаркамі: «За сяброўства, сяброўства!..»*
*Весела выпіваюць, стоячы вакол стала.*

**Вальдэмар.** Я ўсё хацеў спытаць вас, Эдуард Сямёнавіч...

**Левановіч.** Слухаю.

**Антаніна.** Не лезь ты да яго. Няхай паесць.

**Вальдэмар** *(усё роўна як не чуе).* Публіцысты, напрыклад, сцвярджаюць, што некаторыя раёны былі заражаны з самалётаў. І намнога пазней, чым узарваўся рэактар на станцыі?

**Левановіч.** Ва ўсякім выпадку, ніхто з урадавых колаў публіцыстам водпаведзі не даў. Справа ў тым, што даследаваць тую частку тэрыторыі пачалі з вялікім спазненнем. Яшчэ пад самую восень восемдзесят шостага года ўсё, ці амаль усё, канцэнтравалася вакол трыццацікіламетровай зоны.

**Вальдэмар.** Ды ці праўда, што цяжкім алюмініем пасадзілі аблокі на сялянскія гароды?

**Антаніна** *(спыняецца паміж Эдуардам Левановічам і Вальдэмарам).* Адстань!..

**Левановіч.** Тэхнічна гэта магчыма...

**Анатоль Іванавіч.** Таямніцы, таямніцы... Жыццё, як у пякельнай цемрадзі. Але я недзе чытаў, што адзін з лётчыкаў, які скінуў атамную бомбу ці то на Хірасіму, ці то на Нагасакі ў сорак пятым годзе, з’ехаў потым з глузду і трапіў у псіхлячэбніцу.

**Даўгучыц.** Гэта праўда. Але нашы... Не думаю, што хто-небудзь з нашых распыляльнікаў нават прызнаецца калі-небудзь, не тое, што галавой памуціцца.

**Андрэй.** Ну, а што з таго, што прызнаецца? Ну я, напрыклад.

*Але на яго ніхто не звярнуў увагі. Толькі Антаніна стала прабірацца да лётчыка.*

**Антаніна.** У героі, Андрэй Сямёнавіч, захацелі, ці ў дурдом?

**Андрэй.** Не верыце?

**Антаніна.** Вы слаўны хлопчык, Андрэйка. Вам бы ў тэатры першых любоўнікаў іграць, а вы ў герастраты. Не выйдзе. *(Звяртаецца да ўсіх).* Па ўсім відаць, што старэйшы Левановіч не дазволіць і сёння гаварыць нам тосты за яго, то я прапаную – за брата, Андрэя Сямёнавіча! *(Лашчыцца да яго).*

**Вальдэмар.** Які чамусьці прагне ў сучасныя герастраты. У атамныя.

**Анатоль Іванавіч.** Ну, гэта ты... Ты на яго так, бо... Словам, бэсціць – няхітрая справа. А вось за жонкай дагледзець...

*Усе смяюцца. Як у адным парыве падымаюць чаркі.*

**Левановіч.** Андрэй заўтра едзе ў нашу цалкам радыяцыйную вёску. Так што...

**Даўгучыц.** Колькі там?

**Левановіч.** Трыццаць два і пяць дзесятых кюры на кіламетр.

**Даўгучыц.** Гэта – па цэзію.

**Левановіч.** Так што яшчэ невядома, куды лепей трапіць – у псіхлячэбніцу ці ў радыяцыйную вёску. Шчаслівай дарогі табе, брат.

**Даўгучыц.** Вось так і робяцца ў нашай Айчыне героі. Кагосьці высылаюць з Масквы ў Калугу...

**Вальдэмар.** Альбо ў Горкі.

**Даўгучыц.** Так, альбо ў Горкі. Аказваецца, вялікае няшчасце. Увесь свет крычыць і непакоіцца. А што ж нам? Як нам быць, якія жывуць увесь час яшчэ далей ад Масквы, чым Калуга ці Горкі? Значыць, мы ўсё жыццё ў ссылцы знаходзімся?

**Левановіч.** Калі ты маеш на ўвазе канкрэтную асобу, то дарэмна – усё-ткі матэрыяльная база навуковая сёння не ў Горкім ці ў Калузе, а ў Маскве.

**Даўгучыц.** Дык так няхай і гаворыць.

**Левановіч.** Урэшце-то справа ў мінулым. Хоць... што значыць – у мінулым?

**Даўгучыц.** Вось-вось. Гарачае мінулае можа апякаць і сёння. Дый моцна!

*Гаспадыня непрыкметна кліча рукой дзевера. Той выходзіць на кухню.*

**Людміла Міхайлаўна.** Ты заўважыў – святы ўжо не атрымліваюцца? Прынамсі, так, як і раней. Бывала ж, пачынаюць госці размову за сталом, дык заслухаешся.

**Андрэй** *(уздыхае).* Твая праўда, нявестка.

**Людміла Міхайлаўна.** А цяпер ад размоў вушы вянуць: усе ўсё ведаюць, на ўсё ва ўсіх думка ёсць.

**Андрэй.** Нічога не зробіш, Люся. Галоснасць, дэмакратыя. Відаць, да перабудовы ў нашых галовах шмат пустога месца было. Вось цяпер і запаўняем яго гаўном.

**Людміла Міхайлаўна.** Не, ўсё-ткі, бадай, трэба мяняць гасцей. Трэба заводзіць новых. Вунь колькі ў Эдуарда ў інстытуце цікавых вучоных. А ён усё трымаецца за гэтых абываценяў. Мне ўжо цяпер цяжка нават успомніць, як яны ў нас з'явіліся некалі.

**Андрэй** *(усміхаецца).* Стары друг лепей новых двух. Чула такую памоўку.

**Людміла Міхайлаўна.** Чула, чула, але... Ладна, Андрэй, выпіць хочаш?

**Андрэй.** Ты што, дзеля гэтага мяне паклікала сюды? Выпіць можна было і там, разам з усімі.

*Людміла Міхайлаўна, здаецца, не слухае дзевера. Налівае ў чаркі.*

**Людміла Міхайлаўна.** Я хацела спытаць у цябе.

**Андрэй.** Пра што? Ці збіраюся нарэшце жаніцца?

**Людміла Міхайлаўна.** Ды не. Я пра тое... Ну, словам, што гэта ты ляпнуў там за сталом, моў, я вінаваты.

**Андрэй.** У чым?

**Людміла Міхайлаўна.** Ну, у тым, што...

**Андрэй.** А-а, чаму б і не? Сама ж ведаеш, дзе я служу. Загадалі, паляцеў і рассыпаў той алюміній у аблоках, не ведаючы дакладна, што яны радыяцыйныя.

**Людміла Міхайлаўна.** Пабойся бога, Андрэй!.. Што ты гаворыш?

**Андрэй.** Праўду, Люся. Гэта цяпер, у нашы дні, можна загад не выканаць, да чалавецтва апеляваць. А тады – загад, і ўсё тут! Альбо жыць, альбо ўсяго пазбавіцца.

**Людміла Міхайлаўна** *(паверыла).* Бедны брат мой!.. Такую жахлівую тайну на душы насіць! Шкада мне цябе!.. І сябе таксама!.. І ўсіх нас!..

**Андрэй.** А ты кажаш – жаніся. Тут, можна сказаць, ужо да вісельні недалёка. Дарэчы, я не адзін тады вылятаў на заданне. Лёталі і другія.

**Людміла Міхайлаўна.** Ну, а дзе ж тыя, што загад аддавалі?

**Андрэй.** Яны ніколі вінаватыя не бываюць, бо ніхто не ведае, адкуль загад зыходзіў.

**Людміла Міхайлаўна.** Эдуард ведае пра гэта?

**Андрэй.** Наўрад ці.

*Колькі часу сядзяць моўчкі. Людзміла Міхайлаўна пачынае ціха плакаць.*

**Андрэй.** Перастань, Люся.

**Людміла Міхайлаўна.** Бедны мой дзевярок!.. Ты хоць разумееш?..

**Андрэй.** Я ўсё, сястра, разумею. Даўно разумею. І гатовы хоць зараз выскачыць у акно.

**Людміла Міхайлаўна** *(спахопліваецца).* Не гавары глупства, Андрэй. Калі ты збіраешся ехаць у вёску?

**Андрэй.** Заўтра. Трэба магілу матчыну дагледзець. Ну і... Эдзік, нябось, даўно не ездзіў?

**Людміла Міхайлаўна** *(з адчаем).* Калі яму ездзіць? Сам бачыш. А цяпер яшчэ ў народныя дэпутаты збіраецца выбірацца. Пустых акруг многа. Дык... Але

ты, Андрэйка, не гавары яму, калі нават пачне дапытвацца. Ці мала пра што можна жартаваць.

**Андрэй.** Гэта не жарты, сястра.

**Людміла Міхайлаўна.** Хадзем да гасцей. А то мы праз гэту віну тваю...

**Андрэй.** Каб па-сапраўднаму адчуць віну, трэба вачамі пабачыць свой грэх.

**Людміла Міхайлаўна.** Дзеля гэтага і едзеш? Бедны мой брацік!..

**Андрэй.** Ведаеш, мне вось так гаварыла маці: «Бедны Андрэйка, бедны Андрэйка...» Але ўжо калі памерла. У сне. Але не помню – чаму? Толькі ківала галавой і ў вялікай скрусе ўсё роўна як аб нечым папярэджвала: «Бедны Андрэйка, бедны Андрэйка!..»

*Людміла Міхайлаўна фарбуецца. Пасля і яна, і Андрэй ідуць да гасцей.*

## К А Р Ц І Н А V I I

*Вакзал на чыгуначнай станцыі. Паміж людзей – знаёмы пісьменнік Павел Дзямідавіч і Андрэй Левановіч.*

**Пісьменнік.** Як вы трапілі сюды, на край захварэўшай зямлі, Андрэй Сямёнавіч?

**Андрэй.** Гэта ж радзіма мая.

**Пісьменнік.** Ах, так!.. Я ўсё забываюся, што вы, Левановічы, адсюль родам. У якім жа раёне ваша вёска?

**Андрэй.** У суседнім.

**Пісьменнік.** Ах, так!.. Вельмі не пашанцавала вам. І вашым землякам, і вам асабіста. Страціць малую радзіму!.. Але што мы стаім? Хадземце... ну, хоць бы да мяне ў гасцініцу. Я там займаю люксавы нумар. Праўда, без туалета і ўсялякіх іншых выгод. Але сапраўды, зайдзіце, як маеце час. Цягнік на Камунары будзе пазней, пад самы вечар, а я вельмі рады вам.

**Андрэй.** Часу ў мяне да цягніка яшчэ і праўда багата. Толькі навошта па гасцініцах шастаць?

**Пісьменнік.** Як хочаце. Можна і тут перакінуцца словам. Хоць бы ў рэстаране. Праўда, цяпер не тое, што раней. Але, можа, пашанцуе.

**Андрэй.** Не, Павел Дзямідавіч, лепей тут збавім час. Што ў тым рэстаране? Тым больш што нявестка забяспечыла чыстым харчам.

**Пісьменнік.** Ну, як капітан хоча. Але я асабіста люблю, калі ўсё грунтоўна. Значыць, вы са сталіцы зараз?

**Андрэй.** Так.

**Пісьменнік.** Канешне ж, я і забыў – як заўсёды, у брата вашага чарговы дзень нараджэння. Я свае дні нараджэння не толькі не адзначаю, але і не помню. Ну, і што?

**Андрэй.** Успаміналі вас. Хтосьці казаў, што вы цяпер даследуеце вытокі рэк.

**Пісьменнік** *(смяецца).* Гм, даследую... Проста... Адным словам, цягне да чыстых крыніц. Але дзе цяпер чыстая вада? Ды і самі крыніцы – дзе? Адных ужо

няма, а другія прагорклі. Думаў, хоць Бесядзь цячэ сваёй вадой. Дык не. А да таго ездзіў на выток Нёмана. Ніхто не ведае, дзе ён. Меліяратары здратавалі ўсё вакол. Так што Нёман таксама не сваёй вадой цячэ.

*Падыходзяць да лаўкі, сядаюць.*

Вас, Андрэй Сямёнавіч, таксама шматлікія страты чакаюць на радзіме.

**Андрэй.** Я на магілу матчыну еду.

**Пісьменнік.** Я вашу маму помню. Прыязджала часта да Эдуарда Сямёнавіча, як была жывая. А ў мяне ўжо таксама нікога. Дык я і кажу – не пазайздросціш тутэйшым людзям. Ды, няйначай, ужо, лічы, і ўсяму народу. Вось тут, бадай, край так званай чарнобыльскай зямлі. Але ж і тут сёлета трусы паздыхалі, ну, кролікі... Людзі адсюль раз’язджаюцца. Застаюцца адны старыя.

**Андрэй.** Хіба ж ім небяспека не пагражае?

**Пісьменнік.** Я ў адной такой сям’і пабыў – дзед і баба. Кажуць, от нам ужо адзін канец, хоць там, хоць тут; што нам дасць лішні год, а тут свая хата і свой від з парога. Матчына ж хата цэлая?

**Андрэй.** Стаіць.

**Пісьменнік.** Ну і час настаў – стаяць будзе хата, а нікому непатрэбная, заразная!.. Я тут зайшоў у адну бібліятэку, у Чудзянах. Кнігі таксама не вывезеш. Дык і ляжаць, кінутыя на падлозе. І мой трохтомнік на пярэднім плане. Я сфатаграфаваў. Жахліва!..

**Андрэй.** Сапраўды жахліва.

**Пісьменнік.** Асабліва ў нашу разруху, якая завецца перабудовай. Дарэчы, як вы ставіцеся да таго, што робіцца ў краіне? Вы ж вайсковы чалавек. Цярплівасці ў арміі надоўга хопіць?

**Андрэй.** Армію таксама моцна закранула гарбачоўшчына. І разбэсціла. Але, тым не менш, салдаты яшчэ па камандзе паварочваюцца – налева, направа. Прызнацца, шмат пытанняў і ў арміі да ўрада, да парламента. Асабліва шмат іх узнікла, калі пачалі працаваць рэспубліканскія Вярхоўныя Саветы. Лічы, у кожнай рэспубліцы свая дэкларацыя аб незалежнасці. А згодна з ёй – падавай нацыянальную армію і гэтак далей.

**Пісьменнік.** Мінулы год яшчэ я, здаецца, усё здольны быў патлумачыць. Сёлета – не. Можа, таму вось і вандрую па вытоках – ад адной ракі да другой. Дзіўна, га?

**Андрэй.** Цяпер усе кудысьці прагнуць. Адны – у храм, другія...

**Пісьменнік.** У спекуляцыю. Палітычную, калі можна сказаць так, і эканамічную. Я тут, седзячы ў раённай гасцініцы, працаваў паміж паездкамі над артыкулам па заказу адной рэдакцыі. Жыццё, дарагі Андрэй, поўніцца ўсё новымі і новымі парадоксамі і недарэчнасцямі. Хутка мы ўжо няздольныя будзем вызначаць, хто у чым вінаваты.

**Андрэй**. А вінаватыя ёсць? Я хацеў сказаць – усё-ткі вінаватых будуць шукаць бліжэй, чым Сталін ды Троцкі з Бухарыным?

**Пісьменнік** *(усміхаецца).* Гм... Раз ёсць віна, значыць, павінны быць і вінаватыя. Праўда, не кожны адважыцца на прызнанне віны. Я тут чытаў артыкул, дакладней, інтэрв'ю, аднаго карэспандэнта з акадэмікам Аляксандравым. Гаворка ішла пра эсперымент, які прывёў да катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Прэзідэнт акадэміі, атамшчык, клянецца, што нічога не ведаў пра той эксперымент.

**Анадрэй.** Прэзідэнт акадэміі не ведаў? Хлусіць ён!

**Пісьменнік.** Клянецца, што не ведаў. І канструктар чарнабыльскага рэактара, таксама акадэмік, нічога не ведаў.

**Андрэй.** Дзіўна. Але хто ж тады распрацоўваў эксперымент?

**Пісьменнік.** Аказваецца, даручана было падрыхтаваць праект арганізацыі, якая ніколі не мела справы з атамнымі электрастанцыямі.

**Андрэй.** Нават так?

**Пісьменнік.** А я думаю – не тая ў нас дзяржаўная сістэма, каб вось так. Нехта даваў каманду на эксперымент з самага верху. І цяпер хаваецца, калі, вядома, жывы, не ў Крамлёўскай сцяне ўжо. Таксама ж хтосьці камандаваў, калі распылялі ў небе над гэтым краем цяжкі алюміній.

**Андрэй** *(ускідвае галаву).* Думаеце, радыенукліды не маглі заляцець сюды непасрэдна з АЭС?

**Пісьменнік.** Цяжка сказаць, шляхі радыяцыі, як і шляхі боскія, невядомыя, але я таксама схільны думаць, што тутэйшыя раёны заражаны пры дапамозе тэхнікі. Ці то градабойнымі снарадамі, ці то яшчэ нейкім чынам. Таксама загадка.

**Андрэй.** Вы лічыце, што галоўнае – знайсці вінаватых?

**Пісьменнік.** Галоўнае – ратаваць народ ад вымірання. Але без пошуку вінаватых ратаванне таксама не адбудзецца. «Людзі павінны ведаць пра ўсё, у тым ліку, асабіста, і пра тое, хто ў першыя дні ўтойваў сапраўдныя маштабы катастрофы і выдаваў фальшывыя дадзеныя аб радыяцыйнай абстаноўцы. *(Доўга маўчыць).* Мне цяпер нічога не застаецца, як прамаўляць маналогі. Раней я патрабаваў надрукаваць карты забруджаных раёнаў. Смяяліся – моў, такая дзяржаўная тайна, а ён лезе. Нарэшце карты надрукавалі. Цяпер трэба дамагацца, каб перад народам да ганебнага слупа былі пастаўлены вінаватыя за Чарнобыль. Дарэчы, як і за гэту вось разруху. Вы, Андрэй, паездзіце, паходзіце, пабачыце, як тут жывуць цяпер і чым жывуць, і закрычыце немым голасам. Загляніце з дарогі да мяне ў гасцініцу.

**Андрэй.** Добра, Павел Дзямідавіч. Хоць мне, бадай, нялёгка будзе зрабіць гэта...

**Пісьменнік.** Чаму?

**Андрэй.** Не хацелася б называць прычыну. Вось вы казалі пра маналогі, якія даводзіцца часам прамаўляць. Напэўна, цяжка. Але паверце, яшчэ цяжэй чалавеку прамаўляць унутраныя маналогі.

**Пісьменнік.** Унутраныя маналогі... Цяпер наўрад ці хто прамаўляе іх, бо дэфіцыт сумлення. Цяпер усе выкрываюць, даводзяць нешта. Аднак няздольны пачуць адзін аднаго. А ўнутраныя маналогі – гэта ўжо звыш усяго па нашым часе, тайна альбо парок. Ну што ж, Андрэй Сямёнавіч, шчаслівай дарогі вам у нешчаслівую цяпер краіну дзяцінства – можна сказаць, на дно мёртвага мора.

## К А Р Ц І Н А  V I I I

*Кантора саўгаса. На сцяне гаворыць радыё: «Пастанова Вярхоўнага Савета: Вярхоўны Савет адзначае, што аварыя на Чарнобыльскай АЭС па сукупнасці вынікаў з'яўляецца самай буйной катастрофай сучаснасці, агульнанародным бедствам, якое закранула лёс мільёнаў людзей, што жывуць на велізарных тэрыторыях». У саўгаснай канторы два мужыкі чакаюць дырэктара.*

**Першы мужык.** Нарэшце ўспалашыліся *(усё роўна як перадражнівае радыё)* – на велізарных тэрыторыях, агульнанароднае бедства...

**Другі мужык** *(курыць).* Здаецца, бяруцца за нас па сур'ёзнаму.

**Першы мужык.** Ды ўжо каторы год вось так, а мы ўсё загараем ды карэем тут.

**Другі мужык.** Скора, бадай, ужо скура пачне злазіць з касцей, як тая кара з хворых дрэў.

**Першы мужык.** Можа, камусьці гэта выгадна.

**Другі мужык.** Дык каму тады?

**Першы мужык.** А чорт яго ведае, каб жа знаў, дык сам бы чорта лысага з-за печкі вывалак.

**Другі мужык.** Але ж нарабілі смуроду на ўсю зямлю.

**Першы мужык.** Каб жа толькі смуроду? Аднак жа ўжо і гэта добра, што адкрыта прызнаюць.

**Другі мужык.** Спярша людзей заразілі, а тады прызнаюць. Але, яй-богу, і гэты раз каб не засталіся ў дурнях? Дапамогу, якую абяцаюць «чарнобыльцам», здаецца, таксама раскрадуць, як ужо не адзін раз здаралася.

**Першы мужык.** Але ж помню – адразу, як выявілі ў нас гэту радыяцыю, прыязджаў сюды адзін чалавек. Маленькі такі, але порсткі.

**Другі мужык.** Здаецца, з органаў.

**Першы мужык.** Чорт жа яго ведае адкуль! Але ледзьве не наганам па стале. Вы, кажа, што паніку сееце. Ану-тка, на нашага дырэктара, складзіце спісак, хто ў вас агітацыяй займаецца.

**Другі мужык.** Ну, вядома, з органаў. Здаецца ж, не з міліцыі. Дый навошта гэта міліцыянеру дый у грамадзянскім, не ў форме. Дык што дырэктар?

**Першы мужык.** Ну, Антонавіча рукамі не возьмеш. Туз. Адмаўчаўся, і ўсё.

**Другі мужык.** Але ж вось гіцля той з органаў! Здаецца, сам ўжо даўно збег адсюль. Яны, здаецца, усе тыя, што прымушалі нас не панікаваць, пераехалі з заражанай зоны. Ды ўсе ў вышэйшае начальства, чым былі тут, пайшлі. Ты вось пра што мне скажы, Ігнат... *(Не паспявае да канца спытаць).*

*Заходзіць дырэктар саўгаса з Андрэем Левановічам.*

**Першы мужык** *(да дырэктара).* Мы гэта, Антонавіч, прыйшлі спытаць...

**Дырэктар.** Пасля, пасля... Бачыш, чалавек са мной. Зямляк. Так што альбо пачакайце, альбо другі раз.

**Другі мужык.** Дык... здаецца...

**Першы мужык.** Мы пасядзім, Антонавіч. Гэта не тое, што раней. Наша праца цяпер ні сабе, ні людзям. Ты займі чалавека. Дык хто ж ён, наш зямляк?

**Дырэктар.** Хіба не пазнаеш?

**Другі мужык.** Дык... здаецца...

**Дырэктар** *(да Андрэя).* Хадзем, Андрэй Сямёнавіч, хадзем!

*Заходзяць у дырэктараў кабінет. Дырэктар сядае за стол. Андрэй Левановіч падыходзіць да акна, глядзіць на вуліцу.*

Даўно ты ў нас не быў, Андрэй Сямёнавіч. Здаецца, з таго дня, як хавалі вашу маці.

**Андрэй.** Бадай, так.

**Дырэктар.** А вось брат твой ужо і ў радыяцыю прыязжаў. І ведаеш, ён нам дапамог. Праўда, гэта адноснае паняцце ў нашых цяперашніх умовах, дапамога. Вунь, дапамагчы спрабуе ўся дзяржава, а воз, як кажуць, усё там жа. Толькі і прыйшлі да аднаго, што перасяляцца адсюль усё-ткі трэба. Нават месца выбралі.

**Андрэй.** Дзе ж?

**Дырэктар.** За Бялынкавічамі.

**Андрэй.** Хіба там чыста?

**Дырэктар.** Здаецца, чыста. Яна тут, гэтая радыяцыя, неяк лапікамі лягла на зямлю. Помніш пасёлак за Вараноўкай, дык там з пяці двароў два чыстыя, а тры брудныя.

**Андрэй.** Гэта – цэзій?

**Дырэктар.** Так. Іншыя рэчывы... Стронцыю ў нас, здаецца, няма, а пра другія... Відаць, ёсць. Дзён колькі Эдуард Сямёнавіч выступаў на тэлебачанні. Дык казаў, што ёд, цэзій, стронцый гэта не ўсё яшчэ. Яшчэ і іншыя радыёнукліды пагражаюць.

**Андрэй.** Чым жа памог Эдуард?

**Дырэктар.** Бо першы пачаў біць трывогу. Прыязджаў, лаяўся з начальствам, пісаў у газетах. Дакладней, спрабаваў давесці, што здарылася катастрофа. Але ці ў нае жа паслухае хто? Надоўга к нам?

**Андрэй.** Трэба дагледзець матчыну магілку...

**Дырэктар.** А што яе даглядаць? Я нядаўна быў на кладзішчы, то ваша дагледжана. Хтосьці траву выпалаў, кветкі пасаджаны.

**Андрэй.** Ну, усё-ткі... *(Сядае на падаконнік).*

**Дырэктар.** Канешне, канешне!

*Звоніць тэлефон. Дырэктар бярэ трубку.*

*(Хмурыцца).* Хто-хто? А-а-а, Ціхонаўна. Так, пісьмо я атрымаў. *(Слухае).* Усё-ткі не сядзіцца там? Ну што ж, вяртайся, калі табе прыспічыла. *(Слухае).* А можа, пачакаеш трохі, пакуль новыя дамы будуць гатовы? Першы... твой. *(Слухае).* Не будзеш чакаць? Што ж, прыязджай, Ціхонаўна, жывем жа мы неяк тут, пражывеш і ты. *(Кладзе трубку).* Жанчына наша, зарэчанская, пераехала ўсёй сям’ёй. Шукала месца ў «чыстай зоне», а цяпер вось назад. Пытаюся, чаму? Ды

няма сілы, кажа, трываць зняважлівыя адносіны. Ад «чарнобыльскіх» дзяцей адварочваюцца аднакласнікі ў школе, моў, заразныя. Здзекліва ставяцца да чужых вяскоўцы. Словам, нікому мы непатрэбны на ўсім свеце. І гэта не першы выпадак, калі пераехаўшыя сем'і просяцца назад. А я адгаворваю: моў, пачакайце. Не, кажуць, няхай радыяцыя, няхай, ужо што людзям нашым, тое і нам, толькі на радзіме жыць... Бачыш, як паварочваюцца справы?

**Андрэй.** Па дарозе мне чалавек адзін казаў...

*Адчыняюцца дзверы. Андрэй перастае гаварыць.*
*Глядзіць на другога мужыка, які высунуў галаву.*

**Другі мужык.** Можа, вы і праўда тут, Антонавіч, надоўга, дык...

**Дырэктар.** Ну што ў цябе?

**Другі мужык.** Ды, здаецца... Я пра пчолы. Ці будзем выводзіць сёлета на старую пасеку?

**Дырэктар** *(да Андрэя).* Мы, бачыш, яшчэ трымаем пчолы. Кажуць, пчала на дурную кветку не сядзе. Выбера здаровую.

**Другі мужык** *(усё яшчэ з парога).* Дык, здаецца... Яно так. Правяралі мёд у амбулаторыі. Даведка нават ёсць, што незаразны, здаепца...

**Дырэктар** *(да мужыка).* Ладна, Хвядосавіч, ступай, пра пчол яшчэ рана.

**Другі мужык.** Ды не, Антонавіч, здаецца, не рана. Якраз пара. І ў мінулую вясну мы гэтымі днямі вывозілі.

**Дырэктар.** Вясна на вясну не прыпадае. Заўтра пагаворым.

*Другі мужык зачыняе дзверы. Дырэктар чакае, што і першы мужык*
*стане лезці праз дзверы на перамовы, але не. Тады дырэктар паварочваецца*
*да Андрэя, пачынае гаварыць.*

**Дырэктар.** Ладна, Андрэй Сямёнавіч, усяго не спытаеш і не раскажаш. Перанясём асноўную праграму на вечар. Спадзяюся, заначуеш у нас?

**Андрэй.** Як выйдзе.

**Дырэктар.** Выйдзе, выйдзе, Сямёнавіч! Ты не дужа палохайся радыяцыі. За адны суткі не з'есць. Праўда, гледзячы якога. Калі дуплаватага, дык і адных сутак хопіць. Але ж ты – вайсковец. Так што са здароўем у цябе, няйначай, няблага? Ну, а мы гэту радыяцыю ўжо трохі навучыліся выганяць. Балазе, у нас яшчэ талоны тут не ўвялі на спіртное.

**Андрэй.** Ну, а гарэлка... памагае?

**Дырэктар.** Так мы рашылі для сябе – памагае.

*Смяюцца.*

**Дырэктар.** Табе машыну даць да кладзішча?

**Андрэй.** Я сам, дзякуй.

**Дырэктар.** Але з кладзішча зноў прыходзь сюды, каб не дужа бадзяцца. А цяпер... мне таксама часу няма. Разумееш, адбываюцца дзіўныя рэчы. Людзі з партыі выходзяць.

**Андрэй.** Што ж тут дзіўнага? Іначай і не магло быць пры такім становішчы. Партыя страціла ўладу. Кар'ерысты пакідаюць яе.

**Дырэктар.** Хіба толькі адны кар'ерысты? Вось у нас парторг заяву падаў аб выхадзе. У прынцыпе я не супраць, каб выходзілі з партыі. Чым больш так званых камуністаў пакінуць яе, тым шчыльнейшымі і чысцейшымі будуць рады потым. Але ж... шкада вось, што сумленныя. Наш парторг выдатны чалавек, а вось... штосьці зламалася ў ім. Няйначай, таксама радыяцыя падзейнічала. А можа, тупіковая сітуацыя. Праходзяць тады, а мы ўсё гробім тут людзей. Словам, атрымаў я з райкома, як член бюро, заданне пагаварыць з чалавекам.

**Андрэй.** Гэта ўжо канчаткова?

**Дырэктар.** Што канчаткова?

**Андрэй.** Ну, што ён выходзіць? Дарэчы, хто ў вас парторгам?

**Дырэктар.** Ты яго не будзеш ведаць. Але слоў мужык на вецер не кідае. Ну, да сустрэчы. *(Падае Андрэю руку).*

**Андрэй.** А можа?..

**Дырэктар** *(махае рукамі).* Нічога не можа, нічога не можа!.. І слухаць не магу.

## К А Р Ц І Н А   І Х

*На ганку канторы Андрэя чакае першы мужык, той, што ляснікам.*

**Першы мужык.** А я цябе таксама пазнаў, Сямёнавіч, дарма што не паздароўкаўся тады. Мяне ж помніш?

**Андрэй.** Дзядзька Панас?

**Першы мужык** *(уздыхнуўшы).* А я думаў... зараслі мы тут *(чухае рукой па шчэццю)* і састарэлі, акурат грыбы ў атамным лесе, нікому непатрэбныя. Дык і пазнаць цяжка.

*Недзе на вясковым двары чуюцца крык, енкі. Андрэй паварочвае галаву, у той бок, пачынае ўслухоўвацца.*

*(Махае рукой).* Ды гэта так. У нас гэты канцэрт часта бывае. А тым не менш, бабу шкада. Яшчэ маладая дзеўка.

**Андрэй.** Што з ёй?

**Першы мужык.** Так. Чуеш, мужык крычыць, а яна лямантуе? Ды ты не хвалюйся. Мы тут часта гэта слухаем. Афганец у нас вярнуўся з вайны. Можа, помніш – Трахімаў Коля? Ды дзе ты будзеш помніць? Маладыя ўжо без цябе нараслі. Няшчасце з ім – кантузія ў галаву, аднаго скялёпка няма на чэрапе. Вось ён і заводзіцца, калі ў яго гэта пачынаецца. Словам, хвароба. Думалася, што калекі, якія з той вайны прыйшлі, апошнія ў нас, перамёрлі, а тут з гэтай,

афганскай, новых дадалося: то рукі няма, то нагі, а то й галава пашкоджана, як у гэтага.

**Андрэй.** А жонка пры чым?

**Першы мужык.** Дык.. У галаву яму абы-што лезе, хвароба такая. Ну вось ён і ганяе па двары сваю Анюту, моў, давала ўсім тут без мяне. Ну, а калі хвароба мінецца, праходзіць, то чалавеку цаны няма. Але ж – калека... Пенсію даюць... Ты, гэта, ў Афгане не быў?

**Андрэй.** Не.

**Першы мужык.** Пашанцавала. А то ж і вайна аказалася непатрэбная нікому – ні афганцам, ні нам. Усе ад яе, здаецца, адвярнуліся. Моў, памыліліся асобныя члены Палітбюро, тыя, каго ўжо няма ў жывых. А тут калекі...

**Андрэй.** Ну што ж, дзядзька Панас, рады быў сустрэць. Мне на могілкі трэба.

**Першы мужык.** Да маці?

**Андрэй.** Так. *(Сыходзіць з ганка).*

**Першы мужык.** Я таксама на службе, Сямёнавіч. А тым не менш, спяшацца быццам бы і няма куды.

**Андрэй.** Па-ранейшаму лесніком?

**Першы мужык.** Так, так, лесніком. Але цяпер... Словам, як лес наш зрабіўся атамны, служба стала так сабе. Адно званне, што ляснік. Хоць сасна, хоць елка, а нікому непатрэбна ўжо. Нават і дровы, бо радыяцыя ад іх у паветра ўздымаецца. Грыбы таксама не станеш есці, як і ягады. Вось і вандрую дарэмна вакол лесу, баючыся зайсці ў яго. Але ўжо што праўда, то праўда – зладзеі ў нас, здаецца, перавяліся ад гэтай радыяцыі. І ў лесе больш не крадуць, і ў вёсцы.

**Андрэй.** А грошы табе плацяць, як і раней?

**Пёршы мужык.** Гэта плацяць. Ды з надбаўкай, як усім. Грабавыя. Нябось, можа, і не чуў нават, што такія грошы ёсць?

**Андрэй.** Чуў. Што ж ты ў канторы хацеў?

**Першы мужык.** Ды я гэта з пчаляром гэтым, а тут цябе пабачыў з дырэктарам. Хачу спытаць, Сямёнавіч, гэта ж брат твой старшы, здаецца, у вялікіх начальніках цяпер ходзіць?

**Андрэй.** Які ён начальнік. Прафесар.

**Першы мужык.** Ну, усё-ткі прафесар. А вось мой унук у медыцыне. Сёлета канчае.

**Андрэй.** І што?

**Першы мужык.** Дык сам ведаеш – медык, а медыкаў цяпер у зону гоняць. Асабліва тых, што з вёскі самі ці з тутэйшага горада. Ці нельга неяк пасадзейнічаць, каб унука майго не чапалі. Ну, няхай я тут, дык мне, мусіць, наканавана так, а навошта яму раней часу паміраць?

**Андрэй.** Ты б напісаў, дзядзька Панас, Эдзіку пра ўнука. Я нічым памагчы не магу. Нават цяпер не буду заязджаць. Ды і Эдзік наўрад ці дапаможа.

**Першы мужык.** Значыць, не можаш?

**Андрэй.** Не.

**Першы мужык.** А я думаў – дай падыду. Праз цябе папрашу. Цяпер – бачу – дарэмна, Сямёнавіч. Ну, бывай. А з пчоламі яны таксама дарэмна. Нічога

ўжо чыстага ў нас не будзе – ні мёду, ні хлеба, ні вады... Усё Чарнобылем атручана. Во нарабілі людзі дык нарабілі. *(Ідзе).*

*Андрэй яшчэ колькі часу глядзіць услед лесніку, тады рушыць у другі бок па вясковай вуліцы. Зноў чуецца над вёскай жаночы енк. Крычыць, пагражае мужчына.*

## К А Р Ц І Н А Х

*Вяскевыя могілкі. Крыжы – найбольш драўляныя, чорныя, струхлелыя. На гранітным помніку літары: «Кацярына Ягораўна Левановіч». Да магілы падыходзіць Андрэй, сядае на лавачку, здымае фуражку. Падыходзіць жанчына – мясцовая настаўніца Дзіна Давыдаўна.*

**Дзіна Давыдаўна.** Не перашкоджу, Андрэй Сямёнавіч?

**Андрэй** *(устае з лавачкі).* Не, Дзіна Давыдаўна, не перашкодзіце.

**Дзіна Давыдаўна.** А я цябе яшчэ ля саўгаснай канторы ўбачыла. Думаю, хто гэта з лесніком размаўляе. А потым пазнала.

**Андрэй.** А я вось.

**Дзіна Давыдаўна.** Гэта добра, што матчыну магілу не забываеце. Ці не мінулым годам прыязджаў брат, цяпер – ты вось.

**Андрэй.** Я даўно ўжо не быў у вёсцы.

**Дзіна Давыдаўна.** Чаму ж? Хіба такі заняты?

**Андрэй.** Баяўся прыязджаць, Дзіна Давыдаўна.

**Дзіна Давыдаўна.** Радыяцыі баяўся? А мы вось жывём пакуль. Праўда, некаторыя таксама спалохаліся. Падаліся хто куды. А я вось хоць і адна, але жыву пакуль. Сястра паехала ў Ізраіль, а я засталася. Пра ўсё людзі могуць забыць, але каб не вучыць дзяцей? Ды чаго ты баішся, радыяцыі?

**Андрэй.** Не, не радыяцыі баюся. Хоць... прычынай майго страху сапраўды з’яўляецца радыяцыя. Віна вялікая на мне.

**Дзіна Давыдаўна.** Нешта ты загадкамі гаворыш? Зрэшты, у каго няма цяпер віны?.. І ўсё-ткі я цябе не разумею, Андрэй Сямёнавіч? Вось ты сказаў, як пажартаваў, а ў мяне сэрца раптам усё роўна як зрушылася з месца.

**Андрэй.** Прабачце, Дзіна Давыдаўна.

**Дзіна Давыдаўна.** Што тут прабачаць? Я рада бачыць цябе. Ты ж лепшы вучань быў у класе. А такія чалавечыкі ў настаўніка ў памяці. Усе вы, Левановічы, малайцы. Вось нядаўна Эдзіка бачыла, выступаў па тэлебачанні.

**Андрэй.** Я таксама слухаў.

**Дзіна Давыдаўна.** А ўсё-ткі – жахліва гэта ўсё! Дзе ты спыніўся? Хата ж ваша, відаць, сырая стаіць, нятопленая?

**Андрэй.** Не хадзіў.

**Дзіна Давыдаўна.** Тады, можа, да мяне ў школу пойдзеш?

**Андрэй.** Не, я дырэктару абяцаў.

**Дзіна Давыдаўна.** Ну што ж... Дырэктару дык дырэктару... Але, бачыш, за могілкамі ў нас яшчэ даглядаюць. Пра сябе людзі цяпер менш клапоцяцца, а вось

продкам... Чуў? На будучы год пераязджаем усёй вёскай на новае месца? Нікому ўсё гэта не спатрэбіцца. Мёртвыя самі па сабе, жывыя самі. Я ўсё-ткі, няйначай, перашкодзіла табе?

**Андрэй.** Дальбог, не.

**Дзіна Давыдаўна.** Але ж і не падысці да былога вучня... Як гэта? Так што выбачай. А можа, усё-ткі зойдзеш да мяне? Ну хоць бы і пасля дырэктара. А то неяк у нас...

**Андрэй.** Добра, прыйду. Ну, а гаворка?.. Дык гэта я вінаваты.

**Дзіна Давыдаўна.** Што ты ўсё з віной? Гэта выгляд матчынай магілы на цябе падзейнічаў.

**Андрэй.** Не. *(Разводзіць рукамі, паказвае).* Усё гэта!.. *(Пачынае выціраць рукой куточкі вачэй).*

**Дзіна Давыдаўна** *(бярэ Андрэя за локаць).* Э-э, не, Андрэй. У такім стане хадзем лепей да мяне. А то што ў дырэктара саўгаса – зноў п’янка? Не была б я твая старая настаўніца, каб вось так пакінула аднаго. Ну, а паплакаць? Дык на матчынай магіле нават з каменнай душой чалавек адтайвае. Таму не саромся, плач. Лічы, мяне тут не было. Ці, можа, хочаш яшчэ набыць адзін? Дык пабудзь.

**Андрэй.** Так.

**Дзіна Давыдаўна.** То і ладна. Я вось загляну ў адно мёсцейка, а тады сюды вярнуся. Згода?

*Андрэй насуплена ківае галавой. Настаўніца адыходзіць.*

## К А Р Ц І Н А  Х І

*Зноў той жа чыгуначны вакзал. Андрэй толькі што сышоў з цягніка. Як і ў мінулы раз, сярод людзей тоўпіцца наш знаёмы пісьменнік.*

**Пісьменнік** *(бачыць Андрэя).* Добры дзень, таварыш Леановіч. Прызнацца, я чакаў вае пазней.

**Андрэй.** Можна падумаць, што вы з таго дня, як мы сустракаліся, і не пакідалі гэтага вакзала?

**Пісьменнік.** О не, мой малодшы сябра. Я з таго часу паспеў аб’ездзіць усе Злынкі і свету палавінкі. Чулі такі выраз?

**Андрэй.** Не.

**Пісьменнік.** Вось і я дасюль не чуў.

**Андрэй.** А што яшчэ тут можна пачуць, Павел Дзямідавіч?

**Пісьменнік.** Каб чуць народ, трэба вельмі слухаць. Але нешта вы дужа расхрыстаны, Андрэй Сямёнавіч? Жахліва там, на дне мёртвага мора?

**Андрэй.** Так, прыехаў, можна сказаць, расхрыстаны – узнерваваны і абыякавы.

**Пісьменнік.** Хіба так бывае – узнерваваны і абыякавы? І ўсё-ткі хадземце ў гасцініцу. Там і пагаворым.

**Андрэй.** Не, я мушу ехаць.

**Пісьменнік.** На службу? Хто цяпер спяшаецца на службу? Я ўчора званіў вашаму брату. Размаўляў з Людмілай Міхайлаўнай. Вельмі прасіла, каб я прывёз вас.

**Андрэй** *(панура).* Што мне там рабіць?

**Пісьменнік.** Значыць, ні к брату, ні ў гасцініцу да мяне?

**Андрэй.** Паеду адсюль. На Унечы перасяду на другі цягнік і даеду.

**Пісьменнік.** Хіба не ўгавару?

**Андрэй.** Думаю, што не.

**Пісьменнік.** Тады хадземце ў піўніцу. Сёння піва прадаецца. Праўда, гарэлкі няма. Але ж сухі закон паступова страчвае сілу. Яшчэ адна дурная сацыялістычная задума – адвучыць людзей піць! Тых людзей, якія, бадай, з малаком маці да алкаголю прывыкаюць!

*Заходзяць у піўніцу. Павел Дзямідавіч падаецца да буфета, прыносіць адтуль да століка, які выбраў Андрэй Левановіч, бакалы з півам: спярш два, пасля зноў два. Пачынаюць патроху піць ды працягваць ціхую размову.*

**Андрэй.** Вось вы, Павел Дзямідавіч, усё аціраецеся ды аціраецеся на беразе гэтага мёртвага мора, а на дно не ныраеце?

**Пісьменнік.** Было, што ныраў. Нават учора. Так што ў вас, Андрэй Сямёнавіч, няправільнае ўяўленне пра мяне. Памятаеце: «І ўзяў я кніжку з рукі... і з’еў яе; і яна ў вуснах маіх была салодкая, як мёд; калі ж з’еў яе, то горка зрабілася ва ўтробе маёй. І сказаў ён мне: табе трэба зноў прарочыць...»

**Андрэй.** Прарочыць? Я так разумею – пісаць? Пісаць – значыць, прарочыць.

**Пісьменнік.** Не толькі гэта. Там, у Бібліі, яшчэ сказана ў Іаана Багаслова: «...Прарочыць аб народах і плямёнах, і мовах, і царах многіх...»

**Андрэй,** З’ездзілі б вы да нас у вёску. Там сакратар парткома саўгаса з партыі выходзіць.

**Пісьменнік.** Андрэй Сямёнавіч, Андрэй Сямёнавіч, каго цяпер гэтым здзівіш?

**Андрэй.** І ўсё-такі.

**Пісьменнік.** Нарэшце насталі ўмовы пазбавіцца ад сяго-таго, дык вы трывогу пачынаеце біць.

**Андрэй.** Але тады скажыце выразней – па кім цяпер звон б’е?

**Пісьменнік.** Аб нас, аб нас усіх, Андрэй Сямёнавіч. Значыць, штосьці ў чалавеку адбываецца. З кімсьці альбо з чымсьці ў супярэчнасць прыйшоў. Але чаму ён не хоча дачакацца чарговага з’езда? Потым жа відней было б?

**Андрэй.** Я пытаўся ў яго, але ж...

**Пісьменнік.** Я і сам іншы раз думаю – аддаць бы білет!... Але ці гэтым дапаможаш захварэўшаму грамадству? Справа не ў партыях.

**Андрэй.** А ў чым?

**Пісьменнік.** У тым жа захварэўшым грамадстве. Сучаснае духоўнае жыццё адчувае на сабе найбольшыя перагрузкі. Мы ўсе помнім, што пачыналі перабудову з пераробкамі свядомасці, але мала задумаліся над тым, што менавіта

пагэтаму ў гэтай сферы «развітання з мінулым» прасунуліся далей за ўсё. Хіба не дзіўна, што пра грамадства, якое ніколі не жыло пры сапраўдным сацыялізме, гавораць, што яно ў ім расчаравалася... Зразумела я кажу?

**Андрэй.** Так.

**Пісьменнік.** Справа не ў Марксе, а тым болын не ў Леніне. У нас заўсёды ў іхніх поглядах штосьці замоўчвалася, штосьці скажалася, штосьці забаранялася, а штосьці раздзімалася. Але заўсёды гэта рабілася так, як гэта было неабходна камусьці. Напрыклад, такім шляхам знікала розяіца паміж эксплуатацыяй і прыгнётам, паміж абагульненнем і адзяржаўленнем, піто было вельмі важна для кіруючай бюракратыі.

**Андрэй.** Вы лічыце, што з перабудовы нічога вартага не будзе?

**Пісьменнік.** Яшчэ ўчора я вам на гэта пытанне мог адказаць, а сёння... Не ведаю, як з перабудовай будзе, тут трэба ведаць дакладна, дзеля чаго яна распачата. А вось з сацыялізмам...

**Андрэй.** Думаеце?

**Пісьменнік.** І думаю, і баюся!.. Я вам вось што скажу, Андрэй Сямёнавіч. Дваццатае стагоддзе, у якім нам з вамі давялося жыць...

**Андрэй.** Налі ласка...

**Пісьменнік** *(глядзіць на Андрэя).* Ну ды ладна. Падмануў ён нас, дваццаты век, ва ўсім. Можна сказаць, праляцеў для чалавецтва ўпустую.

**Андрэй.** Ну-ну...

**Пісьменнік.** З’явіўся ў нас марксізм, а ў канцы веку з яго адзін пшык. Ва ўсякім выпадку – сёння марксізм пастаўлены пад сумненне. Цяпер возьмем першую сусветную вайну. Што яна дала? Кроў, смерць і Кастрычніцкую рэвалюцыю. Дык цяпер людзі схільны думаць, піто рабілі яе бальшавікі дарэмна. Другая сусветная. Дык што яна дала чалавецтву ў канчатковым выніку? Таксама акрамя крыві ды смерці... Праўда, была закрыта дарога фашызму ў свеце, але ж... і сацыялізм, бачыце, цяпер некаторыя параўноўваюць з фашызмам. Ва ўсякім разе, ва ўсходняй Еўропе яго ўжо няма. Якраз у тых краінах, якія мы ратавалі ў вайну ад фашызму. Ну, а цяпер што тычыцца атамнай энергіі. Назвалі дваццаты век атамным, а ў рэшце рэшт атрымалі Чарнобыль...

**Андрэй.** Куды ж далей, Павел Дзямідавіч?

**Пісьменнік.** У дваццаць першы век, Андрэй Сямёнавіч. Назад дарогі няма. *(Маўчыць, тады пытае).* А што вы нагаварылі Людміле Міхайлаўне? Ніто сказалі такое, чаго яна баіцца? Прасіла мяне па тэлефоне, каб я паглядзеў за вамі.

**Андрэй.** Хочаце ведаць, Павел Дзямідавіч?

**Пісьменнік.** Вядома...

**Андрэй.** Людзі кажуць, што тутэйшыя мясціны заражаны радыяцыяй з самалёта. Чулі?

**Пісьменнік.** Ну, чуў.

**Андрэй.** Дык гэта зрабіў я! Я стварыў гэтае мёртвае мора!

**Пісьменнік.** Пачакайце, Андрэй Сямёнавіч, штосьці не тое вы гаворыце!

**Андрэй.** Якраз тое!

**Пісьменнік.** Пачакайце, пачакайце. Нявестка ваша гаварыла... Але ж не думалася, што вас... Пастойце, пастойце, таварыш капітан...

**Андрэй.** Таму зразумейце, Павел Дзямідавіч, – куды мне адсюль? Тут не толькі ваш бераг, але і мой. Не памінайце хоць вы мяне злым словам!..

*Павел Дзямідавіч глядзіць утрапёна на лётчыка, які прабіраецца паміж столікамі да выхаду, хоча гукнуць назад, але бяссільна апускае руку.*

## К А Р Ц І Н А   X I I

*Гасцініца ў раённым горадзе. Павел Дзямідавіч сядзіць за сталом, корпаецца ў паперах. Стук у дзверы.*

**Пісьменнік.** Калі ласка, заходзьце.

*Заходзіць міліцыянер у афіцэрскім званні і яшчэ цывільны.*

**Міліцыянер.** Таварыш пісьменнік, пракурор раёна прасіў вае нікуды не адлучацца з горада.

**Пісьменнік.** А што здарылася, што я спатрэбіўся пракурору. Што, пачаўся ўсеагульны арышт?

**Міліцыянер.** Вы ведаеце такога лётчыка, капітана Левановіча?

**Пісьменнік.** Так, гэта мей знаёмы. А што?

**Міліцыянер.** Яго знайшлі мёртвым.

**Пісьменнік.** Ах ты, гора! Бяда! Вось табе салодкае і горкае!..

**Міліцыянер.** Нам сказалі, што вы сустракаліся з ім. Таму... Словам...

**Пісьменнік.** Ах ты, гора! Ах ты, бяда!

**Міліцыянер.** Вы не ведаеце прычыну, чаму ён пакончыў з сабой?

**Пісьменнік.** Прычыну? Але пачакайце, нешта я не разумею. Андрэй Левановіч пакончыў з сабой? Але ж ці толькі ён?.. Хіба адзін ён вінаваты?!

*Сноп святла выхоплівае на сцэне маленькага Андрэя Левановіча. Побач, як на вісельні, падвешаны рамкі для партрэтаў. Але саміх партрэтаў няма. Пустыя рамкі...*

## К А Н Е Ц   Д Р А М Ы

# ІВАН ЧЫГРЫНАЎ. ВЕРНАСЦЬ ПРАЎДЗЕ

ВІРТУАЛЬНЫ МУЗЕЙ
НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА
БЕЛАРУСІ

libmogilev.by/chigrinov